Астрыд Ліндгрэн

Малы і Карлсан, які жыве на даху

Мастак Арсен Джанік'ян

Астрыд Ліндгрэн

Малы і Карлсан, які жыве на даху



Photo JACOB FORSELL

1907–2002

Astrid Lindgren

Астрыд Ліндгрэн

Малы і Карлсан, які жыве на даху

Пераклад са шведскай Алесі Башарымавай

Мастак
Арсен Джанік'ян

ПАПУРЫ
Мінск

УДК 821.113.6-34-93
ББК 84(4Шве)-44
Л59

ASTRID LINDGREN
«Lillebror och Karlsson på taket»
First published in 1955 by Rabén & Sjögren, Sweden

For more information about Astrid Lindgren, see www.astridlindgren.com.
All foreign rights are handled by The Astrid Lindgren Company, Lidingö, Sweden.
For more information, please contact info@astridlindgren.se

Для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту

Ліндгрэн, Астрыд

Л59 Малы і Карлсан, які жыве на даху : [для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту] / Астрыд Ліндгрэн ; пер. са швед. А. Башарымава ; маст. А. Джанік'ян. — Мінск : Папуры, 2019. — 168 с. : іл.

ISBN 978-985-15-4259-4.

Гісторыю пра Малога і Карлсана, які жыве на даху, добра ведаюць і любяць дзеткі і іх бацькі ва ўсім свеце. Гумар, займальнасць і незвычайная чуласць да дзіцячай душы — адметнасць твораў Астрыд Ліндгрэн.

Упершыню на беларускай мове выходзяць усе тры кнігі цыкла. Чытайце працяг гісторыі ў нашых выданнях «Карлсан прылятае зноў» і «Карлсан хітруе зноў». А пяшчотныя акварэльныя малюнкі ўкраінскага мастака Арсена Джанік'яна зробяць чытанне яшчэ цікавейшым і па-сапраўднаму незабыўным.

УДК 821.113.6-34-93
ББК 84(4Шве)-44

ISBN 978-985-15-4259-4

© Text: Astrid Lindgren / The Astrid Lindgren Company
© Арсен Джанік'ян, ілюстрацыі, 2018
© Пераклад. Афармленне. Выданне на беларускай мове. ТАА «Папуры», 2019

Змест

Карлсан, які жыве на даху 7

Карлсан будуе вежу 21

Карлсан гуляе ў намёт 37

Карлсан ідзе ў заклад 55

Карлсан хітруе 79

Карлсан гуляе ў прывіда 103

Карлсан чаруе з хітрунскім
сабакам Альбергам 124

Карлсан ідзе на дзень народзінаў 146

Карлсан, які жыве на даху

На самай звычайнай стакгольмскай вуліцы ў самым звычайным доме жыве самая звычайная сям'я на прозвішча Свантэсан. Яна складаецца з самага звычайнага таты, самай звычайнай мамы і трох самых звычайных дзяцей: Бусэ, Бэтан і Малога.

«Ніякі я не звычайны Малы», — кажа Малы. Але гэта ён хлусіць. Вядома, ён звычайны. У свеце столькі хлопчыкаў, якім сем гадоў, у якіх блакітныя вочы, кірпаты нос, нямытыя вушы і вечныя дзіркі на каленках, што Малы, безумоўна, самы што ні ёсць звычайны.

Бусэ пятнаццаць гадоў, ён любіць футбол і кепска вучыцца ў школе, так што і ён зусім сабе звычайны. А Бэтан чатырнаццаць, і валасы ў яе сабраныя ў хвост, зусім як у іншых звычайных дзяўчатак.

На ўвесь дом ёсць толькі адна незвычайная асоба — гэта Карлсан, які жыве на даху. Ужо тое, што ён там *жыве*, вельмі незвычайна. Можа, дзенебудзь у свеце гэта нікога не здзівіла б, але ў Стакгольме амаль ніколі не бывае, каб нехта жыў у малюпасенькім дамочку на даху. А вось Карлсан жыве. Гэта вельмі маленькі, круглы і самаўпэўнены спадар, які да таго ж умее лятаць. Усе ўмеюць лятаць на самалётах або верталётах, а вось лятаць сам па сабе здольны толькі Карлсан. Ён проста паварочвае круцёлку — яна ў яго прыблізна там, дзе пуп, — і — шух! — у яго на спіне заводзіцца мудрагелісты маторчык. Карлсан стаіць нейкі час нерухома, пакуль маторчык раскручваецца. І вось калі той набірае патрэбную хуткасць, Карлсан уздымаецца і, лунаючы, адлятае так гожа і ўзнёсла, нібы ён які-небудзь начальнік канторы — калі толькі магчыма ўявіць начальніка канторы з маторам на спіне.

Карлсан выдатна пачуваецца ў сваім дамочку на даху. Вечарамі ён сядзіць у сябе на ганку, курыць люльку і глядзіць на зоркі. Вядома, з даху зоркі бачныя нашмат лепей, чым з якога іншага месца ў доме, таму, папраўдзе, дзіўнавата, што ніхто болей на даху не жыве. Але жыхары дома не здагадваюцца, што можна жыць і там. Яны нават не ведаюць, што наверсе ёсць Карлсанаў дамок, бо той вельмі

дбайна схаваны за вялікім комінам. Дый, дарэчы, амаль ніхто не заўважае такіх маленечкіх дамкоў, як у Карлсана, нават калі аб іх спатыкнецца. Адзін камінар неяк быў заўважыў Карлсанаў дамок, акурат калі мусіў спускацца ў комін, і здзівіўся не на жарт.

— Нічога сабе, — прамармытаў ён. — Ты глядзі — дом. Вось дык дзіва, сапраўдны дамок, ды яшчэ дзе — проста на даху! І як ён сюды трапіў?

Але потым ён пачаў чысціць комін і зусім забыўся на дамок ды больш пра яго не ўспамінаў.

Вядома, Малы радаваўся, што пазнаёміўся з Карлсанам, бо там, куды ён прылятаў, пачыналіся захапляльныя прыгоды. Карлсан, мабыць, таксама радаваўся, што пазнаёміўся з Малым: што ні кажы, а жыць на самоце ў дамку, дзе пра цябе ніхто не ведае, бадай, не надта весела. Пэўна, здорава, калі ты прылятаеш, а цябе вітаюць: «Здароўценькі, Карлсан!»

Вось як пазнаёміліся Малы і Карлсан.

У гэты дзень усё ішло абы-як, і Малы не адчуваў ніякай радасці ад таго, што ён Малы. Зазвычай быць Малым цудоўна, бо ён жа пястунчык і ўлюбёнец усёй сям'і і ўсе патураюць яму, як толькі могуць. Але здараюцца і цяжкія дні, як цяпер. Мама насварылася, што ён ізноў падраў штаны, Бэтан сказала: «Смаркачы вытры, шмэндрык!» — а тата быў вельмі незадаволены, што ён позна вярнуўся са школы.

— Чаго ты туляешся па вуліцах? — сказаў тата.

Туляешся па вуліцах! Тата ж не ведаў, што Малы сустрэў сабаку. Мілага, прыгожага сабаку, які абнюхаў яго і паматляў яму хвастом з такім выглядам, нібыта хацеў быць сабакам Малога.

Ён бы ім стаў у тую ж хвіліну, калі б гэта залежала толькі ад Малога. Але тата з мамай нізашто не хацелі мець сабаку ў доме. Дый, дарэчы, аднекуль раптам з'явілася цётка і паклікала: «Рыкі, сюды!» — і Малы адразу зразумеў, што гэты сабака ніколі не будзе ягоным.

— Выглядае на тое, што свайго сабакі ў мяне не прадбачыцца да самай смерці, — горка сказаў Малы тым днём, калі ўсё ішло абы-як. — Вось у цябе, мама, ёсць тата, Бусэ і Бэтан заўсёды разам, а ў мяне дык зусім нікога няма.

— Любы ты наш Малы, у цябе ж ёсць мы ўсе, — сказала мама.

— Дзе ўжо — няма! — яшчэ гарчэй сказаў Малы, бо яму раптам падалося, што ў яго і праўда нікога няма ва ўсім свеце. Але адно, прынамсі, у яго было: свой пакой. І ён пайшоў туды.

Стаяў светлы, прыгожы, цёплы вечар, і акно было адчыненае. Белыя фіранкі павольна ўздымаліся і ападалі, нібыта махалі бляклым зорачкам у вясновым небе. Малы падышоў да акна, каб паглядзець

на вуліцу. Ён думаў пра таго мілага сабаку і спрабаваў уявіць, што той робіць цяпер. Можа, ляжыць у сваім кошыку-ляжанцы дзе-небудзь на кухні, а побач з ім сядзіць хлопчык — іншы хлопчык, а не Малы — і гладзіць яго калматую галаву, прыгаворваючы: «Рыкі, ты добры сабака!»

Малы цяжка ўздыхнуў. І тут ён пачуў ціхі гуд. Гуд мацнеў, мацнеў, і раптам да акна павольна падляцеў маленькі таўсматы дзядзечка. Гэта быў Карлсан, які жыве на даху, толькі Малы яшчэ пра яго не ведаў.

Карлсан акінуў Малога доўгім позіркам і паплыў у паветры далей. Палятаў над дахам насупраць, выпісаў круг вакол коміна, а пасля скіраваўся назад да акна Малога. Цяпер ён набраў хуткасць і прасвістаў міма хлопчыка амаль як рэактыўны самалёцік. Некалькі разоў ён так праносіўся побач, а Малы стаяў сабе ціха ды чакаў. У жываце прабірала ад захаплення: не кожнага дня таўсматыя дзядзечкі лятаюць перад вокнамі! Урэшце Карлсан запаволіўся перад самым карнізам.

— Здароўценькі! — сказаў ён. — Можна ненадоўга прызямліцца?

— Можна, калі ласка, — сказаў Малы. — А не складана так вось лятаць? — дадаў ён крыху пасля.

— Толькі не для мяне, — важна адказаў Карлсан. — Для мяне ў гэтым няма нічога складанага. Бо я найлепшы ў свеце лятун. Але не параіў бы ўсялякім мяхам, набітым сенам, спрабаваць за мной паўтарыць.

Малы адчуў, што ён сам акурат і быў такім «мехам, набітым сенам», і цвёрда вырашыў не спрабаваць паўтарыць Карлсанавы манеўры.

— Як цябе завуць? — спытаў Карлсан.

— Малы, — адказаў Малы. — Хаця насамрэч мяне завуць Свантэ Свантэсан.

— Ты падумай, як па-рознаму бывае! Вось мяне дык завуць Карлсан, — сказаў Карлсан. — Проста Карлсан і нічога іншага. Здароўценькі, Малы.

— Здароўценькі, Карлсан, — сказаў Малы.

— Колькі табе гадоў? — спытаў Карлсан.

— Сем, — адказаў Малы.

— Гэта добра. Так трымаць! — сказаў Карлсан.

Ён спрытна перакінуў праз акно таўсматую ножку і ўвайшоў у пакой Малога.

— А табе колькі гадоў? — зацікавіўся Малы, бо яму падалося, што Карлсан занадта дзяціны для дзядзечкі.

— Колькі мне гадоў? — паўтарыў Карлсан. — Я мужчына ў сваім найлепшым веку — гэта адзінае, што я магу сказаць.

Малы не ведаў, што гэта значыць — быць мужчынам у сваім найлепшым веку. Ён задумаўся: а можа, ён таксама мужчына ў сваім найлепшым веку, толькі не ведае пра гэта? Таму асцярожна спытаў:

— А які век найлепшы?

— Любы! — задаволена сказаў Карлсан. — Прынамсі, калі гэта датычыць мяне. Я прыгожы, спрэс

разумны і ўзорна тоўсты мужчына ў сваім найлепшым веку.

Потым ён узяў з кніжнай паліцы паравую машыну Малога.

— Запусцім гэтую штуку? — прапанаваў ён.

— Нельга, тата не дазваляе, — сказаў Малы. — Без таты ці Бусэ мне нельга яе запускаць.

— Без таты, Бусэ або Карлсана, які жыве на даху, — сказаў Карлсан. — Найлепшы ў свеце запускальнік паравых машын — гэта Карлсан, які жыве на даху. Так і перадай свайму тату.

Ён спрытна схапіў пляшку з дэнатуратам, што стаяла каля паравой машыны, напоўніў маленькую спіртоўку і запаліў яе. Хоць Карлсан і быў найлепшым у свеце запускальнікам паравых машын, але ўсё ж праліў на паліцу цэлую лужыну дэнатурату. Лужына загарэлася, і вакол паравой машыны заскакалі вясёлыя сінія язычкі полымя. Малы ўскрыкнуў і кінуўся да паліцы.

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Карлсан, адхіляючы яго пульхнай ручкай.

Але Малы не мог сядзець спакойна і глядзець на гэты пажар. Ён схапіў старую анучу і патушыў вясёлыя язычкі агню. Там, дзе яны танчылі, на лакавай паверхні паліцы засталося некалькі вялікіх, брыдкіх плям.

— Паглядзі, якая цяпер паліца! — захваляваўся Малы. — Што скажа мама?

— Ат, гэта з'ява банальная, — сказаў Карлсан, які жыве на даху. — Парачка дробных плямак на паліцы — гэта з'ява банальная, так і перадай сваёй маме.

Ён апусціўся на каленкі перад паравой машынай, вочы яго гарэлі.

— Зараз затарахціць як мае быць! — сказаў ён.

І праўда, хутка машына завялася. «Тах-тах-тах!» — замармытала яна. О, гэта была найцудоўнейшая паравая машына, якую толькі можна было ўявіць, і Карлсан выглядаў такім гордым і шчаслівым, нібыта сам стварыў яе!

— Трэба праверыць засцерагальны клапан, — сказаў Карлсан і пачаў заўзята круціць нейкую маленькую штучку. — Бяды не мінуць, калі не правяраеш клапана.

«Тах-тах-тах!» — мармытала машына. Яна мармытала хутчэй і хутчэй. «Тах-тах-тах!» Урэшце яна загучала так, нібыта неслася наўскач, і вочы Карлсана заззялі. Малы кінуў пераймацца плямамі на паліцы, яго распірала ад радасці за паравую машыну і Карлсана — найлепшага запускальніка паравых машын, які так здорава праверыў засцерагальны клапан.

— Глядзі, глядзі, Малы, — сказаў Карлсан, — вось гэта тахкае! Найлепшы ў свеце запускальнік паравых ма...

Далей ён не паспеў нічога вымавіць, бо акурат тут жахліва бахнула, і раптам не засталося ніякай паравой машыны, а толькі кавалкі ад яе, раскіданыя па ўсім пакоі.

— Выбухнула! — задаволена сказаў Карлсан, быццам гэта было самае вытанчанае мастацтва, якога можна было чакаць ад паравой машыны. — Сапраўдны выбух! Як бахнула, га!

Але Малому нешта было нявесела. У вачах стаялі слёзы.

— Мая паравая машына, — сказаў ён. — Яна зламалася.

— Гэта з'ява банальная, — сказаў Карлсан і абыякава адмахнуўся пульхнай ручкай. — Хутка ты атрымаеш новую машыну.

— Дзе ж я яе вазьму? — здзівіўся Малы.

— У мяне наверсе іх некалькі тысяч.

— Дзе гэта — у цябе наверсе? — спытаў Малы.

— У мяне наверсе ў маім дамку на даху, — адказаў Карлсан.

— У цябе дом на даху? — спытаў Малы. — І ў ім тысячы паравых машын?

— Ну, можа, якіх пару соцень дык ёсць, — сказаў Карлсан.

— О, я вельмі-вельмі хацеў бы пабачыць твой дом! — усклікнуў Малы. Здавалася неверагодным, што на даху мог быць маленькі дамок і што Карлсан жыве ў ім.

— Гэта ж трэба — дом, поўны паравых машын! — не супакойваўся Малы. — Некалькі соцень паравых машын!

— Ну, я не лічыў дакладна, колькі там засталося, але некалькі тузінаў дык дакладна, — сказаў Карлсан. — Якая-ніякая часам выбухне, але парачка тузінаў у мяне знойдзецца заўсёды.

— Дык, можа, я змагу ўзяць адну? — абрадаваўся Малы.

— Вядома! — сказаў Карлсан. — Вядома!

— Вось проста зараз? — спытаў Малы.

— Ну, не, спачатку мне трэба яе паглядзець, — сказаў Карлсан. — Праверыць засцерагальны клапан і ўсё такое. Спакойна, толькі спакойна! Атрымаеш сваю машыну іншым разам.

Малы пачаў збіраць кавалкі таго, што раней было яго паравой машынай.

— Ой, што тата скажа... — з трывогай прамармытаў ён.

Карлсан здзіўлена прыўзняў бровы.

— Пра паравую машыну? — удакладніў ён. — Гэта з'ява банальная, і на гэты конт яму зусім не варта перажываць, так яму ад мяне і перадай. Я і сам бы яму гэта сказаў, калі б меў час сустрэцца з ім. Але я ўжо мушу вяртацца, трэба прыглядаць за домам.

— Здорава, што ты завітаў, — сказаў Малы, — хаця машына... Ты яшчэ прыляціш?

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Карлсан і павярнуў круцёлку, якая была ў яго прыблізна на пупе. Матор закерхаў, а Карлсан стаяў нерухома і чакаў, пакуль набярэцца хуткасць для палёту. Тады ён узняўся і праляцеў пару колаў па пакоі.

— Матор барахліць, — сказаў ён. — Пэўна, трэба зазірнуць у майстэрню змазацца. Мог бы і сам, праўда, я ж найлепшы ў свеце змазвальнік матораў. Але часу бракуе... Не, думаю, завалюся ў майстэрню.

Малы таксама падумаў, што гэта будзе самае разумнае.

Карлсан скіраваў проста ў расчыненае акно, і яго маленькая круглявая постаць прыгожа вымалёўвалася на зорным вясновым небе.

— Бывай здароўценькі, Малы! — памахаў ён пульхнай ручкай.

А потым знік.

Карлсан будуе вежу

— Я ж *сказаў*, што яго зваць Карлсан і ён жыве на даху, — паўтарыў Малы. — Што тут такога дзіўнага? Хто дзе хоча, той там і жыве!

— Малы, кінь выдурняцца, — сказала мама. — Ты ледзь не да смерці нас перапалохаў. Цябе ж магло забіць выбухам ад машыны, ці ты не разумееш?

— Так, але Карлсан усё адно найлепшы ў свеце запускальнік паравых машын, — сур'ёзна паглядзеў на маму Малы. Ён мусіў пераканаць яе, што немагчыма сказаць не, калі найлепшы ў свеце запускальнік паравых машын прапануе завесці тваю машыну.

— Трэба адказваць за свае ўчынкі, Малы, — сказаў тата, — а не звальваць усё на таго, каго завуць Карлсан, які жыве на даху, і каго не існуе.

— Ён яшчэ як існуе! — сказаў Малы.

— І лятаць ён умее таксама, — здзекліва вымавіў Бусэ.

— Умее, уяві сабе, — адказаў Малы. — Спадзяюся, ён ізноў прыляціць, тады пабачыш.

— Вось бы ён прыляцеў заўтра! — сказала Бэтан. — Я табе крону падару, Малы, калі ты пакажаш мне Карлсана, які жыве на даху.

— Заўтра ён не прыляціць дакладна, — сказаў Малы, — ён збіраўся заваліцца ў майстэрню, каб змазацца.

— От цябе таксама, відаць, трэба змазаць як след, — злавалася мама. — Ты паглядзі, у што ператварылася паліца!

— Гэта з'ява банальная, так кажа Карлсан!

Малы абыякава адмахнуўся, зусім як Карлсан, каб мама зразумела, што нейкая там паліца і праўда не вартая сварак. Але на маму гэта не падзейнічала.

— Вось як, Карлсан так кажа? — сказала яна. — Перадай Карлсану, што калі ён яшчэ раз пакажа сюды свой нос, я так яго змажу, што ён век не забудзе!

Малы не адказаў. Яго жахала тое, што мама магла такое сказаць пра найлепшага ў свеце запускальніка паравых машын. Але чаго было чакаць ад такога дня, калі ўсе, як відаць, вырашылі быць абы-якімі.

Малы раптам засумаваў па Карлсану. Карлсан быў такі жывы і вясёлы, а як ён растапырваў пальцы ды казаў, што ўсе няшчасці — з'ява банальная, і няма чаго праз іх перажываць! Малы засумаваў па Карлсану моцна, па-сапраўднаму. І адначасова ўстрывожыўся: а раптам ён ніколі болей не прыляціць?

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Малы сам сабе, зусім як Карлсан. — Ён абяцаў вярнуцца.

А Карлсан быў з тых, каму можна давяраць, гэта было бачна. Не мінула і пары дзён, як ён з'явіўся зноў. Малы ляжаў ніцма на падлозе ў сваім пакоі і чытаў, калі пачуў той самы гуд. І вось Карлсан прашумеў і заляцеў праз акно, нібы вялізны чмель. Аблятаючы сцены пакоя, ён напяваў вясёлую песеньку. Раз-пораз ён прыпыняўся, каб паразглядаць карціны, схіляў галаву набок і прымружваў вочы.

— Прыгожыя карціны, — сказаў ён. — Надзвычай прыгожыя карціны! Але, мабыць, усё ж не такія прыгожыя, як мае.

Малы ўскочыў з падлогі і стаў, а ўнутры ўсё ў ім кіпела ад узрушанасці. Як ён быў рады, што Карлсан вярнуўся!

— А ў цябе многа карцін там, наверсе? — спытаў ён.

— Некалькі тысяч, — адказаў Карлсан. — Сам іх малюю ў вольныя хвіліны. Процьма маленькіх пеўнікаў, птушачак і іншай прыгажосці. Я найлепшы ў свеце малявальнік пеўняў, — дадаў Карлсан і прызямліўся побач з Малым, выпісаўшы элегантную дугу.

— Гэта ж падумаць! — сказаў Малы. — Паслухай... А ці можна мне паляцець з табой, паглядзець твой дом, твае машыны паравыя, твае карціны?

— Вядома, можна, — сказаў Карлсан. — Чаму не? Шчыра цябе запрашаю. Як-небудзь іншым разам.

— Толькі хутка! — папрасіў Малы.

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Карлсан. — Спачатку мне трэба крыху прыбрацца, але гэта не зойме шмат часу. Адгадай, хто найлепшы ў свеце хуткасны прыбіральнік? — жартаўліва спытаўся Карлсан.

— Мабыць, ты, — сказаў Малы.

— Мабыць! — усклікнуў Карлсан. — Мабыць... Ты не мусіш сумнявацца ў гэтым ні хвіліны. Найлепшы ў свеце хуткасны прыбіральнік — Карлсан, які жыве на даху. Гэта вядома кожнаму чалавеку.

І Малому падумалася, што Карлсан, пэўна, ва ўсім найлепшы ў свеце. Найлепшым у свеце сябрам па гульнях ён быў дакладна, гэта адчувалася адразу.

Крыстэр і Гуніла, вядома, былі добрыя, але ж не такія цікавыя, як Карлсан, які жыве на даху. Малы вырашыў, што раскажа Крыстэру і Гуніле пра Карлсана, калі яны будуць вяртацца са школы наступным разам. Крыстэр звычайна бясконца гаварыў пра свайго сабаку Ёфу. Малы ўжо даўно яму зайздросціў праз гэтага сабаку. «Хай толькі заўтра ён ізноў завядзе катрынку пра свайго няшчаснага Ёфу — я тады раскажу яму пра Карлсана, — падумаў Малы. — Хто такі Ёфа ў параўнанні з Карлсанам, які жыве на даху?! — так яму і скажу».

І ўсё адно больш за ўсё на свеце Малы прагнуў завесці ўласнага сабаку.

Карлсан перапыніў яго думкі.

— Я схільны крыху пазабаўляцца, — сказаў ён і цікаўна агледзеўся. — У цябе няма яшчэ паравой машыны?

Малы паматаў галавой. Паравая машына! Карлсан акурат у яго, нарэшце мама і тата могуць пабачыць, што ён існуе. І Бусэ з Бэтан таксама, калі яны дома.

— Не хочаш пайсці са мной і павітацца з мамай і татам? — прапанаваў Малы.

— З задавальненнем, — сказаў Карлсан. — Яны будуць радыя са мной сустрэцца, з такім прыгожым і спрэс разумным!

Карлсан прайшоўся туды-сюды па пакоі з задаволеным тварам.

— І ўзорна тоўстым да таго ж, — дадаў ён. — З мужчынам у сваім найлепшым веку. Твая мама будзе радая са мной сустрэцца.

У гэты самы момант Малы адчуў пах катлет, якія мама смажыла на кухні, і зразумеў, што хутка будзе абед. Малы вырашыў пазнаёміць Карлсана з мамай і татам пасля таго, як усе паядуць. Мамам ні ў якім разе нельга замінаць, калі яны смажаць катлеты: нічога добрага з гэтага не бывае. Да таго ж хто ведае, ці не захочуць мама з татам пагаварыць з Карлсанам пра паравую машыну або плямы на кніжнай паліцы. А гэтага нельга дапусціць. Напэўна, за абедам Малы зможа неяк па-хітраму патлумачыць бацькам, як трэба абыходзіцца з найлепшым у свеце запускальнікам паравых машын. Яму трэба толькі крыху часу. Пасля абеду — гэта будзе самае тое. Тады ён прывядзе да сябе ў пакой усю сям'ю.

«Прашу знаёміцца — Карлсан, які жыве на даху!» — скажа ён.

Вось яны здзівяцца! І як весела будзе глядзець на іх здзіўленне!

Раптам Карлсан перастаў хадзіць па пакоі. Ён застыў і пачаў ветрыць носам, як паляўнічы сабака.

— Катлеты! — сказаў ён. — Маленькія смачненькія катлеткі я *дужа* люблю.

Малы крыху сумеўся. На такое мог быць хіба толькі адзін адказ.

«Хочаш застацца і паабедаць у мяне?» — вось што ён мусіў бы сказаць. Але ён пабаяўся прыцягнуць з сабой за стол Карлсана вось так, нібы нічога ніякага. Зусім іншая рэч, калі ў яго гасцявалі Крыстэр і Гуніла. Тады ён мог прыйсці хоць у апошні момант, калі ўсе ўжо сабраліся за сталом, і сказаць: «Матуля, можна Крыстэру з Гунілай таксама пакласці крыху гарошку і блінчыкаў?»

Але зусім незнаёмага таўсматага дзядзечку, які зламаў паравую машыну і пасадзіў плямы на паліцы, — не, яго ён не мог прывесці проста так.

Хаця толькі што гэты самы таўсматы дзядзечка выразна сказаў, што дужа любіць маленькія смачныя катлеткі. І Малы мусіў падбаць, каб ён іх атрымаў, а іначай, можа, Карлсан не захоча болей з ім гуляць. О, як шмат залежала ад маміных катлет!

— Пачакай тут крыху, — сказаў Малы, — я схаджу на кухню прынясу некалькі.

Карлсан задаволена кіўнуў.

— Добра, — сказаў ён. — Добра! Але паспяшайся! Адным глядзеннем на карціны сыты не будзеш, хай яны сабе з пеўнямі ці без!

Малы хуценька пабег на кухню. Мама стаяла каля пліты ў клятчастым фартуху, ахутаная найцудоўнейшым катлетным водарам. Яна страсянула патэльню над агнём, і ў той заскакала процьма маленечкіх, акуратных карычневых катлетак.

— Здароў, Малы, — сказала мама. — Хутка будзем есці.

— Матуля, а можна мне пару катлетак на сподачку, я сабе ў пакой забяру? — папрасіў Малы сваім самым упрошвальным голасам.

— Сонейка, мы ж праз пару хвілін ужо будзем есці, — сказала мама.

— Ведаю, і ўсё адно, — сказаў Малы. — Пасля абеду я патлумачу навошта.

— Добра, добра, — сказала мама. — Вось табе пару штучак!

Яна паклала шэсць катлетак на маленькую талерачку. О, як чароўна яны пахлі, якія яны былі маленькія, карычневыя і прыгожыя — акурат такія, як трэба! Малы асцярожна ўзяў талерку аберуч і хуценька панёс яе ў свой пакой.

— Вось, Карлсан! — гукнуў ён, адчыніўшы дзверы.

Але Карлсан знік. Малы стаяў там з катлетамі, а Карлсана як ветрам змяло. Малы страшэнна зажурыўся: усё адразу зрабілася такім сумным!

— Ён паляцеў, — сказаў хлопчык сам сабе ўголас. Але тут...

— Піп, — раптам пачуў ён кагосьці. — Піп!

Малы азірнуўся навокал. У нагах ложка, пад коўдрамі, віднеўся невялікі тоўсценькі гарбок. Ён варушыўся. Піск ішоў адтуль. Праз секунду з-пад коўдры паказаўся чырвоны твар Карлсана.

— Хі-хі, — сказаў Карлсан. — Паляцеў! — сказаў ты. Ён паляцеў! Хі-хі, а я зусім і не паляцеў! Я проста так прыкінуўся.

Тут ён убачыў катлеткі. «Чык!» — павярнуў ён крацёлку на жываце. Матор загудзеў, і Карлсан плаўна пераляцеў з ложка проста да талеркі, мімалётам падчапіў адну катлетку, шпарка ўзняўся пад столь і пачаў лятаць вакол люстры, смакуючы катлеціну.

— Смаката! — сказаў ён. — Надзвычай смачная катлетка! Можна было б падумаць, што яе прыгатаваў найлепшы ў свеце катлетны смажун, але гэта, відавочна, *не так*.

Ён рэзка апусціўся да талеркі і схапіў яшчэ адну.

Тут з кухні паклікала мама:

— Малы, мы сядаем есці, мый хутчэй рукі і прыходзь!

— Мне трэба зноў ненадоўга сысці, — сказаў Малы і адставіў талерку. — Але я хутка вярнуся. Абяцай, што дачакаешся мяне!

— Добра, але чым мне бавіцца ўвесь гэты час? — спытаў Карлсан, прызямляючыся каля Малога з дакорлівым плюхам. — Мне трэба які-небудзь вясёлы занятак. У цябе зусім-зусім не засталося паравых машын?

— Зусім-зусім, — сказаў Малы. — Але ты можаш узяць мой канструктар.

— Давай яго сюды, — сказаў Карлсан.

Малы дастаў канструктар з шафы, у якой трымаў свае цацкі. Гэта быў сапраўды цудоўны канструктар з мноствам дробных дэталек, якія можна было прыкручваць адну да адной і рабіць розныя рэчы.

— Вось, трымай, — сказаў ён. — Можна будаваць машыны, пад'ёмныя краны і ўсё што захочаш...

— Ты думаеш, найлепшы ў свеце будавальнік не ведае, што можна, а чаго нельга пабудаваць? — сказаў Карлсан. Потым ён спрытна засунуў у рот яшчэ адну катлецінку і накінуўся на скрынку з канструктарам.

— Паглядзім, паглядзім, — сказаў ён і высыпаў усе дэталі на падлогу.

Малы мусіў сысці, хаця нашмат ахвотней ён бы застаўся паглядзець, як найлепшы ў свеце будавальнік возьмецца за справу на ўсім сур'ёзе.

Апошняе, што пабачыў Малы, азірнуўшыся ў дзвярах, — гэта Карлсана, які сядзеў на падлозе, задаволена напяваючы сабе пад нос:

— Які разумны я... І здольны як ніхто... І ўзорна тоўсты я... Гам! — апошняе слова ён праспяваў праз секунду пасля таго, як праглынуў чацвёртую катлетку.

Мама з татам і Бусэ з Бэтан ужо сядзелі за сталом. Малы праслізнуў на сваё месца і начапіў сурвэтку.

— Паабяцай мне адну рэч, мама. І ты таксама, тата, — сказаў ён.

— Што нам трэба паабяцаць? — спытала мама.

— Спачатку паабяцайце! — сказаў Малы.

Тата не надта хацеў абяцаць нешта вось так, проста з моста.

— Хто цябе ведае, можа, ты зноўку хочаш, каб я паабяцаў табе сабаку, — сказаў ён.

— Не, гэта зусім не пра сабаку, — сказаў Малы, — але яго ты таксама можаш паабяцаць, калі хочаш. Не, гэта нешта іншае, нічога небяспечнага! Паабяцайце, што вы абяцаеце!

— Ну добра, калі так, то абяцаем, — сказала мама.

— Ага, вы толькі што паабяцалі нічога не казаць Карлсану пра паравую машыну! — задаволена сказаў Малы.

— Ха, — сказала Бэтан. — Як яны змогуць нешта сказаць Карлсану, калі яны ніколі яго не сустрэнуць?

— Ну *вядома*, яны яго сустрэнуць, — пераможна сказаў Малы. — Пасля абеду. Ён цяпер у маім пакоі.

— Ой, я ледзь катлетай не падавіўся! — сказаў Бусэ. — Карлсан — у тваім пакоі?

— Уяві сабе, ён там!

Гэта і праўда была пераможная хвіля Малога. О, хутчэй бы яны ўжо даелі — тады яны пабачаць...

Мама пасміхнулася.

— Мы будзем вельмі радыя сустрэцца з Карлсанам, — сказала яна.

— Так, і Карлсан сказаў тое самае! — запэўніў Малы.

Нарэшце яны даелі фруктовы суп. Нарэшце мама паднялася з-за стала. Настаў вялікі момант.

— Хадземце разам, — сказаў Малы.

— Упрошваць не трэба, — сказала Бэтан. — Я не супакоюся, пакуль не ўбачу гэтага твайго Карлсана.

Малы пайшоў першы.

— Запомніце, што вы паабяцалі, — сказаў ён, перш чым адчыніць дзверы ў свой пакой. — Ні слова пра паравую машыну!

Ён націснуў на ручку дзвярэй і адчыніў іх.

Карлсана ў пакоі не было. Ён *знік*. Пад коўдрай на ложку Малога не ўздымаўся пульхны гарбок.

Але пасярод раскіданай на падлозе кучы драўляных цурбэлак узвышалася вежа. Вельмі высокая і вельмі вузкая вежа. Хаця Карлсан, вядома, мог набудаваць і пад'ёмных кранаў, і ўсялякага іншага, гэтым разам ён задаволіўся тым, што склаў кубікі адзін на адзін у вельмі высокую і вельмі вузкую вежу. Зверху яе ўпрыгожвала тое, што, відавочна, мусіла быць купалам, — маленькая кругленькая катлетка.

Карлсан гуляе ў намёт

Гэта быў цяжкі момант для Малога. Маме не спадабалася, што яе катлеты пускаюць на купалы, і яна, вядома, лічыла, што гэта Малы так прыгожанька аздобіў вежу.

— Карлсан, які жыве на даху... — пачаў быў Малы, але тата строга перапыніў:

— Досыць ужо гэтых тваіх фантазій пра Карлсана, Малы!

Бусэ і Бэтан толькі пасмяяліся.

— Бач ты, які гэты Карлсан, — сказаў Бусэ. — Гэта ж трэба яму было змыцца акурат тады, калі мы хацелі з ім пазнаёміцца!

Малы сумна з'еў катлету і сабраў свае кубікі. Не было ніякага толку больш гаварыць пра Карлсана. Але без яго было сумна, страшэнна сумна.

— Хадземце піць каву, а на Карлсана давайце забудземся, — сказаў тата і суцяшальна пагладзіў Малога па шчацэ.

Яны заўжды пілі каву перад камінам у гасцёўні, і сёння ўвечары таксама, хаця стаяў цёплы вясновы вечар і ліпы на вуліцы перад домам ужо выпусцілі зялёныя лісточкі. Малы не любіў каву, але затое любіў сядзець разам з мамай, татам, Бусэ і Бэтан перад агнём.

— Заплюшчы вочы, мама, — папрасіў Малы, калі мама паставіла на столік перад камінам паднос з кавай.

— Навошта гэта?

— Ну, бо ты казала, што не хочыш бачыць, як я ем цукар, а я хачу якраз узяць кавалачак, — сказаў Малы.

Яму трэба было чымсьці суцешыцца, гэта ён выразна адчуваў. Чаму Карлсан паляцеў? Ну праўда, нельга ж так рабіць — знікнуць, пакінуўшы па сабе толькі маленькую катлетку.

Малы сядзеў на сваім улюбёным месцы на прымурку каміна, каб быць як мага бліжэй да агню. Гэты час, калі яны пілі пасля абеду каву, быў самы прыемны за ўвесь дзень. Можна было размаўляць з татам і мамай, і яны слухалі, што ты кажаш, — бо іншым разам у іх не заўсёды быў на гэта час. Было весела таксама слухаць, як Бусэ і Бэтан пацвельвалі адно аднаго, як гаманілі пра сваё «батанства». Тое «батанства» было, відаць, зусім іншым, лепшым ты-

пам вучобы, чым у малодшай школе, куды хадзіў Малы.

Малы вельмі хацеў бы таксама расказаць пра сваё «батанства», але акрамя мамы з татам ніхто не цікавіўся, што з ім адбывалася ў школе. Бусэ і Бэтан з гэтага толькі смяяліся, а Малы быў вельмі акуратны з тым, што магло выклікаць у Бусэ і Бэтан гэты здзеклівы смех. Хаця дражніць яго не было сэнсу, бо ён быў майстар дражніцца ў адказ — ён проста *мусіў* умець гэта рабіць, маючы такога брата, як Бусэ, і такую сястру, як Бэтан.

— Ну як, Малы, ці змог ты сёння адказаць на ўроку? — пацікавілася мама.

Размовы *такога* кшталту Малы не любіў. Але раз ужо мама нічога яму не сказала наконт кавалачка цукру, ён быў гатовы перажыць гэтае пытанне.

— Анягож! *Вядома ж*, я змог адказаць, — хмура вымавіў ён.

Ён увесь час думаў пра Карлсана. Як мог нехта патрабаваць ад яго, каб ён памятаў пра ўрокі, пакуль ён не ведае, куды падзеўся Карлсан!

— Ну а што вы праходзілі? — спытаў тата.

Малога пачала разбіраць злосць. Яны ўвесь час збіраюцца так працягваць? Хіба для гэтага яны так утульна селі перад агнём — каб пагаманіць пра ўрокі?

— У нас быў алфавіт, — паспешліва адказаў Малы. — Цэлы даўжэзны алфавіт, і я яго ведаю. Спачатку ідзе «А», а потым ужо ўсе астатнія літары!

Ён узяў яшчэ адзін кавалачак цукру і зноў падумаў пра Карлсана. Хай сабе размаўляюць і балбочуць у яго над вухам колькі ім заманецца — ён будзе думаць пра Карлсана і гадаць, ці пабачыць яго зноўку.

З гэтых мрояў яго абудзіла Бэтан.

— Малы, ты што, не чуеш? Хочаш зарабіць дваццаць пяць эрэ?

Да Малога павольна дайшло, што яна кажа. Ён быў зусім не супраць зарабіць дваццаць пяць эрэ, але гэта залежала ад таго, што Бэтан ад яго хоча.

— Дваццаць пяць эрэ — занадта мала, — занатурыўся ён. — Цяпер усё такое дарагое. Як ты думаеш, колькі, напрыклад, каштуе марозіва за пяцьдзясят эрэ?

— Дай здагадаюся, — з хітраватым тварам сказала Бэтан. — Мабыць, пяцьдзясят эрэ?

— Менавіта, акурат столькі яно і каштуе, як бачыш, — сказаў Малы. — Таму сама разумееш: дваццаць пяць эрэ — гэта занадта мала.

— Ты ж яшчэ не ведаеш, пра што гаворка, — сказала Бэтан. — Табе не трэба нічога рабіць, наадварот, трэба толькі чагосьці *не рабіць*.

— Чаго не рабіць?

— Не паказвацца тут у гасцёўні сёння ўвечары.

— Пэле прыйдзе, ясна табе? — сказаў Бусэ. — Новы хлопец Бэтан.

Малы кіўнуў. Вось як, значыць, яны ўсё прадумалі. Мама з татам пойдуць у кіно, Бусэ — на футбол, Бэтан будзе сядзець і буркаваць у гасцёўні, а Малога выправяць у ягоны пакой — за няшчасныя дваццаць пяць эрэ. Ну і сямейка, калі падумаць!

— Якія ў яго вушы? — спытаў Малы. — Такія ж растапыраныя, як у твайго былога хлопца?

Гэта быў спосаб пацвяліць Бэтан.

— Чуеш, што ён кажа, мама? — сказала яна. — Разумееш цяпер, чаму я хачу пазбавіцца ад Малога? Ён адпужвае кожнага, хто да мяне прыходзіць!

— О, ты перабольшваеш, — прымірэнча сказала мама, якая не любіла, калі яе дзеці сварацца.

— Яшчэ як адпужвае, — запэўніла Бэтан. — Хіба ён не адвадзіў Класа? Ён тады стаў перад ім, утаропіўся, глядзеў-глядзеў і як выдаў: «Такія вушы Бэтан не даспадобы». Ясна, што Клас так больш і не завітаў з таго разу.

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Малы тонам Карлсана. — Спакойна, толькі спакойна! Я *пасяджу* ў сябе — і зусім задарма. Я не бяру платы за тое, каб мяне не бачылі.

— Цудоўна, — сказала Бэтан. — Пакляніся толькі! Пакляніся, што не будзеш паказвацца ўвесь вечар!

— Клянуся, — сказаў Малы. — Я не шалею па гэтых тваіх Пэлях, можаш не сумнявацца. Я б сам заплаціў дваццаць пяць эрэ, абы іх толькі не бачыць!

Крыху пазней Малы і праўда ўжо сядзеў у сваім пакоі — зусім задарма. Мама і тата выправіліся ў кіно, Бусэ сышоў, а з гасцёўні Малы мог, прыадчыніўшы дзверы, пачуць слабое, ціхае мармытанне. Гэта Бэтан буркавала там са сваім Пэле. Малы пару разоў адчыняў дзверы і прыслухоўваўся, пра што яны гаварылі, але не мог нічога расчуць. Тады ён стаў каля акна і пачаў глядзець у сутонне. Ён зірнуў уніз на вуліцу — раптам пабачыць Крыстэра і Гунілу? Але там былі толькі вялікія хлопцы, і яны дубасіліся. Было вельмі цікава назіраць, пакуль доўжылася бойка, але яна, на жаль, хутка скончылася, і ўсё зноўку зрабілася гэткім жа нудным.

Тут ён пачуў чароўны гук. Гэта было гудзенне матора, а праз секунду ў акно заплыў Карлсан.

— Здароўценькі, Малы, — бестурботна сказаў ён.

— Здароўценькі, Карлсан, — сказаў Малы. — Куды ты прапаў?

— Як гэта? Ты пра што? — спытаў Карлсан.

— Ну, ты ж быў знік, — сказаў Малы. — Калі ты мусіў пазнаёміцца з мамай і татам. Чаму ты паляцеў?

Карлсан узяўся ў бокі, і выгляд у яго зрабіўся вельмі сярдзіты.

— Не, такога я яшчэ не чуў! — сказаў ён. — Можа, пра свой дом клапаціцца ўжо і не трэба? Хіба домаўласнік не павінен даглядаць свой дом, га? Што загадаеш мне рабіць, калі твае мама з татам прыходзяць выказаць мне пашану акурат тады, калі я займаюся сваім домам?

Ён агледзеўся ў пакоі.

— Наконт дамоў, — сказаў ён. — Дзе мая вежа? Хто разбурыў маю прыгожую вежу? І дзе мая катлетка?

Малы пачаў запінацца:

— Я не думаў, што ты вернешся, — роспачна сказаў ён.

— Анягож! — сказаў Карлсан. — Найлепшы ў свеце будавальнік будуе вежу — і што адбываецца? Нехта спраўляе маленькі парканчык вакол яе і пільнуе, каб вежа стаяла на месцы ва ўсе дні? Не, дзе ўжо там! Разбураюць, абрынаюць — вось што яны робяць, ды яшчэ і з'ядаюць чужыя катлеты!

Карлсан адышоўся, сеў на ложак і надзьмуўся.

— Ат, гэта з'ява банальная, — сказаў Малы і махнуў рукой, як рабіў Карлсан. — Няма пра што турбавацца.

— Вось як ты загаварыў, — абурана сказаў Карлсан. — Вядома, лёгка ўсё паламаць, а потым проста сказаць, што гэта з'ява банальная, што няма чаго турбавацца. А я ж пабудаваў тую вежу вось гэтымі няшчаснымі ручкамі!

Ён сунуў свае пульхныя ручкі пад самы нос Малому. Потым зноў сеў на зэдлік і захмурыўся як ніколі.

— Я з табой не гуляю, — сказаў ён. — Я з табой не гуляю, калі ўсё гэтак.

Малы быў у адчаі. Ён стаяў і не ведаў, што яму рабіць. Доўгі час яны маўчалі. Урэшце Карлсан сказаў:

— Калі б я атрымаў маленькі падаруначак, магчыма, я зноў бы павесялеў. Не дакладна, але, *магчыма*, я зноў бы павесялеў, калі б атрымаў які-небудзь маленькі падаруначак.

Малы падбег да стала і пачаў заўзята корпацца ў шуфлядцы, бо там у яго было нямала цудоўных штук. Там былі ягоныя маркі і каменныя шарыкі, каляровыя крэйдачкі і цынавыя салдацікі. А яшчэ там ляжаў кішэнны ліхтарык, які ён дужа любіў.

— Хочаш сабе яго? — спытаў ён, паказваючы Карлсану ліхтарык.

Той адразу яго схапіў.

— Якраз нечым такім і мусіць быць тое, што маглo б развесяліць мяне зноў, — сказаў Карлсан. — Ён не такі цудоўны, як мая вежа, але калі я атрымаю яго, то ўсё ж паспрабую *крышачку* развесяліцца.

— Ён твой, — сказаў Малы.

— Ён жа гарыць? — з падазрэннем спытаў Карлсан і ўключыў ліхтарык. І праўда — той засвяціў, і вочы Карлсана таксама заззялі.

— Уяві: цяпер, гуляючы па даху восеньскімі вечарамі, калі вакол так цёмна, я змагу пасвяціць ім і знайсці свой маленькі дамок і не заблукаю між комінаў, — сказаў ён і пагладзіў ліхтарык.

Малы вельмі ўсцешыўся, пачуўшы словы Карлсана. Ён толькі хацеў, каб той аднойчы ўзяў яго з сабой пагуляць па даху і паглядзець, як Карлсан свеціць ліхтарыкам у цемры.

— Ну здароўценькі, Малы, вось я і зноў вясёлы! — сказаў Карлсан. — Вядзі сваіх маму з татам знаёміцца са мной.

— Яны ў кіно пайшлі, — сказаў Малы.

— Пайшлі ў кіно! Калі маглі сустрэцца са *мной*! — агаломшана сказаў Карлсан.

— Так, дома толькі Бэтан... Ну і яе новы хлопец. Яны ў гасцёўні, і мне нельга туды выходзіць.

— Што я чую? — ускрыкнуў Карлсан. — Ты не можаш пайсці куды табе заманецца? Я не збіраюся цярпець гэтага ні хвіліны. Давай, хадзі сюды...

— Але ж я паабяцаў, — сказаў Малы.

— А я абяцаю, што калі Карлсан бачыць несправядлівасць, то налятае на яе, як каршун! — сказаў Карлсан. — А што *дакладна* ты ім паабяцаў?

— Я паабяцаў не паказвацца ў гасцёўні ўвесь вечар.

— Ну, значыць і не пакажашся, — сказаў Карлсан. — Але ж ты, пэўна, хочаш паглядзець на новага хлопца Бэтан?

— Ну, ведаеш, праўду кажучы, хачу, — горача сказаў Малы. — Раней у яе быў адзін, ну проста з недаравальна растапыранымі вушамі! Дык хачу паглядзець, якія вушы ў гэтага новага.

— Вось і я б паглядзеў, — сказаў Карлсан. — Пачакай крыху, і я што-небудзь нахітрую. Найлепшы хітрун у свеце — гэта Карлсан, які жыве на даху.

Ён агледзеўся ў пакоі.

— Ну вось, — кіўнуў ён. — У нас ёсць коўдра... Якраз тое, што трэба. Я ж ведаў, што нештачка нахітрую.

— І што ты нахітраваў? — пацікавіўся Малы.

— Ты абяцаў не паказвацца ў гасцёўні ўвесь вечар, праўда ж? Але калі ты пойдзеш туды пад коўдрай, дык і не пакажашся.

— Так... але... — пачаў быў Малы.

— Калі ты пойдзеш туды пад коўдрай, дык і не пакажашся, і ніякіх «так-але», — адрэзаў Карлсан. — А калі я пайду пад коўдрай, то таксама не пакажуся, і тым горай для Бэтан. Калі ўжо яна такая дурніца, то так мяне і не пабачыць! Небарака, бедненькая Бэтан!

Ён схапіў коўдру з ложка Малога і накінуў яе сабе на голаў.

— Хадзі сюды да мяне! — крыкнуў ён. — Хадзі ў мой намёт!

Малы залез да яго пад коўдру. Карлсан задаволена пасмейваўся.

— Бэтан жа не казала, што не хоча бачыць у гасцёўні намёта? Любы чалавек быў бы рады пабачыць намёт. Асабліва такі, у якім нешта свеціцца, — сказаў Карлсан і ўключыў ліхтарык.

Малы не быў упэўнены, што Бэтан узрадуецца намёту, але яму вельмі падабалася сядзець з Карлсанам пад коўдрай і свяціць ліхтарыкам. Малы сказаў, што было б гэтак сама весела нават не хадзіўшы ні да якіх Бэтан: можна застацца

і пагуляць у намёт у ягоным пакоі. Але на гэта Карлсан не пагадзіўся.

— Не выношу несправядлівасць, — сказаў ён. — Я траплю ў гасцёўню, чаго б гэта ні каштавала!

І вось намёт пасунуўся да дзвярэй. Малому заставалася толькі рухацца разам з ім. Пульхная далонь высунулася з-пад коўдры, ухапілася за ручку дзвярэй і ціха ды асцярожна іх адчыніла. Намёт выслізнуў у вітальню, якая аддзялялася ад гасцёўні толькі тоўстай заслонай. Мармытанне зрабілася больш выразным, але ўсё адно не настолькі, каб можна было разабраць словы. Лямпа ў гасцёўні не гарэла, Бэтан і ейнаму Пэле, відавочна, хапала слабага, цьмянага святла звонку.

— Гэта добра, — прашаптаў Карлсан. — Значыць, мой ліхтарык будзе нашмат лепей бачны.

Акурат тады ліхтарык у яго быў выключаны.

— Бо мы мусім з'явіцца як радасная і прыемная нечаканасць, — прашаптаў Карлсан і ўхмыльнуўся пад коўдрай.

Ціха і павольна намёт наблізіўся да заслоны. Бэтан і Пэле сядзелі на маленькай канапе каля супрацьлеглай сцяны. Ціха, павольна намёт скіраваўся туды.

— Ты мне падабаешся, Бэтан, — пачуў Малы хрыплы голас хлопца.

Які ж ён недарэка, гэты Пэле!

— Праўда? — сказала Бэтан, і зноў зрабілася ціха.

Быццам цёмная навала, па падлозе рухаўся намёт, павольна і няўхільна падступаючыся да канапы, бліжэй і бліжэй. Вось засталося ўсяго пару крокаў — але двое на канапе нічога не чулі і не заўважалі.

— А я табе падабаюся, Бэтан? — вельмі сарамяжліва спытаў Пэле.

Хлопец не паспеў атрымаць адказу. Бо акурат у гэты міг шэрыя цені пакоя разрэзала святло ліхтарыка і ўдарыла яму проста ў твар. Ён ускочыў, Бэтан ускрыкнула, пачуліся смешкі і тупаценне, якія таропка аддаляліся ў вітальню.

Калі цябе толькі што асляпіла ліхтарыкам, ты нічога не можаш бачыць. Затое *пачуць* — можаш. Так што Бэтан і ейны Пэле пачулі той смех. Дзікі, задаволены смех, што пырскаў з-за заслоны.

— Гэта мой гадкі меншы брат, — сказала Бэтан. — Ну цяпер ён ужо ў мяне атрымае…

Малы заліваўся так, што аж хапаўся за жывот.

— Ну вядома ж, ты ёй падабаешся! — крыкнуў ён. — Чаму б ты не падабаўся? Бэтан *усе* хлопцы падабаюцца, калі ты не ведаў!

Потым пачуўся грукат і яшчэ крыху смешак.

— Спакойна, толькі спакойна, — прашаптаў Карлсан, калі намёт кульнуўся падчас шалёнага адступлення да дзвярэй.

Малы стараўся быць спакойным, хаця ў ім усё яшчэ клекатаў смех, і хаця Карлсан паваліўся проста на яго, так што было не разабраць, дзе нага Карлсана, а дзе ягоная ўласная, і хаця ён разумеў, што Бэтан можа накінуцца на іх у любы міг.

Яны хуценька ўсхапіліся на ногі і рынуліся да пакоя Малога ў суцэльнай паніцы, бо Бэтан была ўжо блізка.

— Спакойна, толькі спакойна, — шаптаў Карлсан, і яго круглявыя ножкі тупацелі пад коўдрай, як барабанныя палачкі. — Найлепшы ў свеце хуткасны бягун — гэта Карлсан, які жыве на даху! — шаптаў ён, але гучаў пры гэтым вельмі запыхана.

Малы таксама бег даволі шпарка. Анягож, было куды спяшацца! Яны ўратаваліся ў самую апошнюю секунду, заскочыўшы ў пакой Малога. Карлсан спрытна павярнуў ключ і ціха ды задаволена запырскаў смехам, стоячы за дзвярыма, у якія малаціла Бэтан.

— Пачакай у мяне, Малы, я да цябе дабяруся! — злосна крычала яна.

— Але я, прынамсі, у гасцёўні не паказаўся! — крыкнуў Малы. І з-за дзвярэй зноў пачулася хіхіканне.

Хіхікалі *двое,* і Бэтан выдатна б гэта пачула, калі б не была такая раз'юшаная.

Карлсан ідзе ў заклад

Аднойчы Малы вярнуўся са школы раззлаваны і з вялікім гузаком на лбе. Мама была на кухні, і, як Малы і спадзяваўся, гузак яе моцна ўразіў.

— Родны ты мой, што з табой здарылася? — усплёснула яна рукамі.

— Крыстэр кінуў у мяне каменем, — сярдзіта сказаў Малы.

— Не, гэта ж трэба! — сказала мама. — Які злы хлопчык! Чаму ты не прыйшоў і не расказаў мне?

Малы паціснуў плячыма.

— А толку? Ты ж не ўмееш кідацца камянямі. Ты б нават у сцяну стайні ні разу не патрапіла.

— Ах, дурненькі, — сказала мама. — Няўжо ты думаеш, што я стала б кідацца ў Крыстэра камянямі?

— А чым тады? — здзівіўся Малы. — Нічога іншага ж няма, прынамсі, настолькі ж добрага.

Мама ўздыхнула. Відавочна, не толькі Крыстэр любіў пабіцца. Яе ўласны пястунчык быў нічым не лепшы. Але як так магло стацца, што такі маленькі хлапчук з такімі лагоднымі блакітнымі вачыма быў гэткім задзірам?

— А што, калі вам кінуць звычку заўсёды біцца? — прапанавала мама. — Можна ж замест гэтага *дамаўляцца*? Ведаеш, Малы, насамрэч няма нічога, з чым нельга разабрацца, як след пагаварыўшы.

— Ёсць, і яшчэ як, — сказаў Малы. — Учора, напрыклад. Я тады таксама пабіўся з Крыстэрам...

— І зусім дарэмна, — сказала мама. — Вы з тым жа поспехам маглі высветліць, за кім праўда, у разумнай гутарцы.

Малы сеў за абедзенны стол і апусціў пабітую галаву на рукі.

— Гэта ты так думаеш, — зіркнуў ён на маму. — Вось што Крыстэр мне сказаў: «Я магу табе задаць перцу», — сказаў ён. А я яму кажу: «Рукі ў цябе кароткія для гэтага». Ну і як, скажы ты мне, мы маглі гэта высветліць у разумнай гутарцы?

Мама не магла адказаць і адразу спыніла сваю мірную казань. Яе сынок-задзіра выглядаў даволі

змрочна, і яна паспяшалася паставіць перад ім гарачы шакалад са свежымі булачкамі. Малы іх вельмі любіў. Ён адчуў водар свежай здобы яшчэ калі падымаўся сходамі. Маміны чароўныя булачкі з карыцай прынамсі рабілі жыццё не такім невыносным.

Малы задумліва куснуў булачку, і пакуль ён еў, мама заляпіла яго рану на лбе пластырам. Потым лёгенька цмокнула яго ў пластыр і спытала:

— А што вы сёння з Крыстэрам не падзялілі?

— Крыстэр і Гуніла кажуць, што Карлсана не бывае. Яны гавораць, што ён — проста выдумка, — сказаў Малы.

— А гэта не так? — асцярожненька пацікавілася мама.

Малы з прыкрасцю паглядзеў на яе з-па-над кубка.

— Хоць ты можаш верыць таму, што я кажу? — сказаў ён. — Я пытаўся ў Карлсана, ці не выдумка ён...

— І што Карлсан адказаў? — спытала мама.

— Ён сказаў, што *калі б* ён быў выдумкай, дык гэта была б найлепшая ў свеце выдумка. Але так ужо здарылася, што ён ніякая не выдумка, — сказаў Малы і ўзяў яшчэ адну булачку. — Карлсан лічыць, што гэта Крыстэр і Гуніла — выдумка. На дзіва недарэчная выдумка, кажа ён, і я таксама так думаю.

Мама не адказала. Яна разумела, што не дасць рады фантазіям Малога, і таму толькі сказала:

— Я думаю, табе трэба болей гуляць з Крыстэрам і Гунілай і меней думаць пра Карлсана.

— Карлсан прынамсі не кідаецца ў мяне валунамі, — сказаў Малы і памацаў гузак на лбе. Потым задумаўся пра нешта і сонечна ўсміхнуўся маме:

— Дарэчы, сёння я пабачу, дзе жыве Карлсан, — сказаў ён. — Я ледзьве не забыўся пра гэта!

Ён адразу пашкадаваў, што сказаў гэта маме. Як ён мог так спудлаваць?

Але для мамы ў яго словах было не больш небяспечнага ці трывожнага, чым у любой згадцы пра Карлсана, і яна безуважна сказала:

— Вось як? Ну дык ты добра пазабаўляешся.

Яна б не была такой спакойнай, калі б удумалася ў словы Малога. І ўспомніла пра тое, дзе жыве Карлсан!

Малы падняўся з-за стала сыты, задаволены і раптоўна вельмі ўсцешаны сваім светам. Гузак на лбе больш не смылеў, у роце ўсё яшчэ адчуваўся смак булачак з карыцай, праз акно на кухні свяціла сонца, а мама ў клятчастым фартуху выглядала вельмі мілай і зграбнай. Ён моцна абняў яе і сказаў:

— Ты мне падабаешся, мама.

— О, я вельмі радая, — сказала мама.

— Так... ты падабаешся мне за ўсю гэтую сваю мілату.

Потым ён пайшоў да сябе і сеў чакаць Карлсана. Яны паляцяць разам на дах — і хай сабе Крыстэр гаворыць, нібыта Карлсан — усяго толькі выдумка!

Чакаць давялося доўга.

«Я прылячу прыблізна а трэцяй або чацвёртай ці пятай, але не хвілінай не раней за шэсць», — сказаў яму Карлсан.

Малы так і не зразумеў дакладна, а якой Карлсан збіраўся прыляцець, і перапытаў.

«Не хутчэй, чым а сёмай, у любым разе, — сказаў Карлсан. — Але наўрад ці да васьмі. І ведаеш што, чакай прыблізна прыкладна а дзявятай, бо тады будзе самы час!»

Малому давялося чакаць цэлую вечнасць, і ўрэшце ён амаль паверыў, што Карлсан узяў і ператварыўся ў звычайную выдумку. Але раптам пачулася звыклае гудзенне, і ў пакой заляцеў Карлсан, бадзёры і вясёлы.

— О, як я чакаў! — сказаў Малы. — Калі ты там мусіў прыляцець?

— *Прыблізна*, — сказаў Карлсан. — Я сказаў, што прылячу прыблізна, — і так я і зрабіў.

Ён падышоў да акварыума Малога, усунуў увесь твар у ваду і заглыкаў вялікімі каўткамі.

— Ой, асцярожна з маімі рыбкамі! — занепакоіўся Малы. Ён спалохаўся, што Карлсан выпʼе з вадой некалькі яго рыбак-гупі, якія жвава плавалі ў акварыуме.

— Калі ў цябе гарачка, трэба піць увесь час, — сказаў Карлсан. — Калі і праслізне якая рыбінка ці дзве — дык гэта з'ява банальная!

— У цябе гарачка? — спытаў Малы.

— Ды шчэ якая! Памацай, — сказаў Карлсан і паклаў руку Малога сабе на лоб.

Але Малы не мог сказаць, каб Карлсан быў асабліва цёплы.

— Якая ў цябе тэмпература? — спытаў ён.

— Вох, трыццаць-сорак градусаў, — сказаў Карлсан. — Не меней!

Малы нядаўна перахварэў на адзёр і ведаў, што значыць быць у гарачцы. Ён пахітаў галавой.

— Не думаю, што ты хворы, — сказаў ён.

— І не сорамна табе? — тупнуў нагой Карлсан. — Я што, *зусім* не магу пахварэць, як іншыя людзі?

— Ты хочаш хварэць? — не паверыў Малы.

— Усе людзі хочуць, — сказаў Карлсан. — Я хачу ляжаць у сваім ложку з высокай-высокай тэмпературай, і каб ты спытаў, як я пачуваюся, а я б адказаў, што я самы хворы ў свеце, а ты б тады спытаў, ці хачу я, каб ты прынёс чаго-небудзь, а я б сказаў, што я такі хворы, такі хворы, што нічога і не хачу... Апрача толькі вялізнага кавалка торта, і процьмы печыва, і кучы шакаладу, і гары карамелек.

Карлсан з надзеяй паглядзеў на Малога, у якога раптам апусціліся рукі: ён не ведаў, дзе яму зараз знайсці ўсё тое, чаго хоча Карлсан.

— Я хачу, каб ты быў для мяне як маці, — працягваў Карлсан. — Ты скажаш, што мне трэба выпіць нейкія агідныя лекі... Але за гэта я мушу атрымаць пяць эрэ. А яшчэ ты абматаеш мне шыю цёплым ваўняным шалікам, але я буду казаць, што ён казычацца... Калі не атрымаю яшчэ пяць эрэ.

Малы вельмі хацеў быць Карлсану як маці. А гэта значыла, што ён мусіць спустошыць сваю скарбонку-свінку. Яна стаяла на кніжнай паліцы, важкая і дыхтоўная. Малы прынёс з кухні нож і пачаў выкалупваць манеткі па пяць эрэ. Карлсан дапамагаў тым, што горача і з дзікім захапленнем вітаў кожную манетку, якая выпадала са шчыліны. Часам яны былі па дзесяць і па дваццаць эрэ, але Карлсану найбольш падабаліся пятакі.

Пасля Малы збегаў у крамку з садавіной і амаль на ўсе грошы купіў карамелек і шакаладу. А калі выклаў на прылавак свой капітал, на міг яго працяла думка, што ён збіраў гэтыя грошы на сабаку. Ён ціха ўздыхнуў, бо разумеў: той, хто хоча быць Карлсану як маці, не можа сабе дазволіць утрымліваць сабаку.

Вяртаючыся, Малы старанна пазасоўваў ласункі ў кішэні і зазірнуў у гасцёўню. Там былі ўсе: мама, тата, Бусэ і Бэтан. Яны пілі паабедзенную каву. Але сёння Малому не было часу з імі сядзець. На міг ён задумаўся, ці не паклікаць іх у пакой пазнаёміцца з Карлсанам, але, паразважаўшы, вырашыў, што не варта. Тады яны толькі перашкодзяць яму выправіцца з Карлсанам на дах. Лепей пазнаёміць іх у які іншы дзень.

Малы ўзяў трохі міндальнага печыва з падноса — бо Карлсан жа сказаў, што хацеў таксама і печыва, — і кінуўся да сябе ў пакой.

— І доўга мне сядзець і чакаць, хвораму і разбітаму? — папракнуў яго Карлсан. — Тэмпература падымаецца на некалькі градусаў штохвіліны, на мне ўжо можна яйкі варыць.

— Я бег з усіх ног, — сказаў Малы. — Я столькі ўсяго панакупляў...

— Але ў цябе ж засталіся грошы, каб даць мне пяць эрэ, калі шалік заказыча? — з трывогай спытаў Карлсан.

Малы супакоіў яго. Ён прыхаваў парачку пятакоў.

Вочы Карлсана заззялі, і ён заскакаў ад радасці.

— О, я самы хворы ў свеце! — сказаў ён. — Трэба як найхутчэй пакласці мяне ў пасцель.

Толькі цяпер Малы задумаўся пра тое, як ён зможа трапіць на дах, не ўмеючы лятаць.

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Карлсан. — Я вазьму цябе на спіну — і здароўценькі — мы паляцім да мяне. Глядзі толькі, не ўсунь пальцы ў прапелер.

— Але ты ўпэўнены, што падымеш мяне? — спытаў Малы.

— Там паглядзім, — адказаў Карлсан. — Будзе вельмі цікава праверыць, ці пранясу я цябе больш за паўдарогі ў такім хворым і разбітым стане. Але заўсёды ёсць выйсце: калі адчую, што не спраўляюся, я магу цябе скінуць, і ўсё.

Малому не падалося такім ужо добрым гэтае выйсце — каб яго скінулі напаўдарозе да даху, і выгляд у яго зрабіўся вельмі задумлівы.

— Але ўсё будзе добра, гэта дакладна, — сказаў Карлсан. — Калі толькі матор не заглухне.

— А калі заглухне? Мы ж тады ўпадзём, — сказаў Малы.

— Плясь! Вядома, упадзём, — весела сказаў Карлсан. — Але гэта з'ява банальная, — дадаў ён і адмахнуўся.

Малы вырашыў таксама лічыць, што гэта з'ява банальная. Ён напісаў маме з татам невялікую запіску і паклаў яе на стале.

Я на версі У Калсана які жыве на Даху

Лепей было б паспець вярнуцца да таго, як яны заўважаць запіску. Але калі бацькі раптам па ім засумуюць, трэба, каб яны ведалі, дзе ён. Іначай магла зноў усчацца шуміха, як таго разу, калі ён быў у бабулі і вырашыў сам пакатацца на цягніку. Мама пасля плакала і казала:

— Але ж, Малы, калі ты ўжо захацеў пакатацца на цягніку, чаму ты не сказаў пра гэта мне?

— Таму што я *хацеў* пакатацца на цягніку, — адказаў Малы.

Тое самае было і цяпер. Ён *хацеў* трапіць на дах да Карлсана, і таму найлепш было нікому пра гэта не казаць. Калі тата з мамай заўважаць, што яго няма, ён заўсёды зможа апраўдацца тым, што прынамсі пакінуў ім запіску.

Карлсан быў гатовы да старту. Ён павярнуў крацёлку на жываце, і матор загудзеў.

— Заскоквай! — крыкнуў ён. — Паляцелі!

І яны паляцелі — праз акно і ў паветра. Карлсан зрабіў дадатковае маленькае кола над бліжнімі дахамі, каб праверыць, ці добра працуе матор. Той гудзеў так роўна і гожа, што Малому ні кропелькі не было страшна, а толькі весела.

Урэшце Карлсан прызямліўся на іхні родны дах.

— А зараз паглядзім, ці знойдзеш ты мой дамок, — сказаў Карлсан. — Я не буду падказваць, што ён ззаду за комінам, гэта ты ўжо сам шукай.

Малы раней ніколі не бываў ні на якім даху. Але часам ён бачыў, як дзядзькі счышчалі з дахаў снег і хадзілі па іх з прывязанай вакол пояса вяроўкай. Малы заўсёды лічыў, што тыя, хто робіць гэта, шчаслівыя людзі. Але цяпер ён сам быў такім жа шчаслівым — хаця ў яго вакол пояса, вядома, ніякай вяроўкі не было. У жываце так дзіўна казытала, калі ён ішоў да коміна, намагаючыся трымаць раўнавагу! За комінам і праўда быў дамок Карлсана. О, які ён быў мілы: з зялёнымі аканіцамі і ўтульным ганкам, на якім можна было сядзець калі захочаш! Але акурат цяпер Малому хацелася толькі як найхутчэй трапіць у дамок і паглядзець на паравыя машыны, карціны з пеўнямі і ўсё іншае, што было ў Карлсана.

На дзвярах вісела шыльдачка, каб было бачна, хто тут жыве. На ёй было напісана:

«КАРЛСАН,
ЯКІ ЖЫВЕ НА ДАХУ,
НАЙЛЕПШЫ Ў СВЕЦЕ
КАРЛСАН»

Карлсан расчыніў дзверы і крыкнуў:

— Дабрыдзень у хату, любы Карлсан... і табе, Малы, таксама!

І ён ускочыў уперад Малога ў дом.

— Мне трэба ў ложак, бо я самы хворы на свеце! — крыкнуў ён і стрымгалоў кінуўся на маленькую чырвоную канапку, што стаяла пры сцяне.

Малы ўвайшоў следам. Яго разбірала цікаўнасць. У Карлсана было вельмі ўтульна, гэта Малы ўбачыў адразу. Акрамя канапкі, тут стаяў сталярны варштат, які, было відаць, служыў Карлсану і за стол, а таксама шафа, пара крэслаў і камін з жалезнай рашоткай. На ёй, пэўна, Карлсан гатаваў сабе ежу.

Але ніякіх паравых машын не было і знаку. Малы доўга азіраўся, не заўважыў ніводнай і ўрэшце спытаў:

— А дзе твае паравыя машыны?

— Кхм, — сказаў Карлсан. — Мае машыны... Яны ўсе выбухнулі. Няспраўнасці ў засцерагальных клапанах, няйначай! Але гэта з'ява банальная — няма чаго і перажываць.

Малы агледзеўся зноў.

— Ну а твае карціны з пеўнямі, яны што, таксама выбухнулі? — вельмі з'едліва спытаў ён Карлсана.

— Яшчэ чаго! — сказаў Карлсан. — Дзе ж яна ў мяне? — дадаў ён і паказаў на аркушык, прышпілены да сцяны каля шафы. У самым нізе, у куточку аркушыка і праўда быў намаляваны пеўнік, зусім маленечкі чырвоны пеўнік. Больш на аркушы не было нічога.

— Карціна называецца «Вельмі самотны певень», — сказаў Карлсан.

Малы паглядзеў на пеўніка. Тысяча Карлсанавых карцін з пеўнямі ў выніку аказаліся вось гэтым няшчасным небаракам?

— Вельмі самотны певень, намаляваны найлепшым у свеце малявальнікам пеўняў, — дрыготкім голасам сказаў Карлсан. — О, якая гэта прыгожая і сумная карціна! Але плакаць мне нельга, бо падымецца тэмпература.

Ён кінуўся на падушкі і схапіўся за лоб.

— Ты павінен быць для мяне як маці. Пачынай! — сказаў ён.

Малы не зусім ведаў, з чаго яму пачаць.

— У цябе ёсць якія-небудзь лекі? — з сумневам спытаўся ён.

— Ёсць, але я не хачу іх прымаць, — сказаў Карлсан. — А ў цябе ёсць пятак?

Малы выцягнуў з кішэні штаноў пяць эрэ.

— Дай яго мне спачатку, — сказаў Карлсан.

Малы даў яму пятак. Карлсан моцна зацiснуў яго ў руцэ, і выгляд у яго зрабіўся вельмі хітры і задаволены.

— Я ведаю, ад якіх лекаў я не адмоўлюся, — сказаў ён.

— Ад якіх? — зацікавіўся Малы.

— Ад кукарэкавых лекаў Карлсана, які жыве на даху! Яны складаюцца напалову з карамелек і напалову з шакаладу. Дадаеш крыху крошак ад печыва і змешваеш усё гэта як след. Зрабі як я кажу, і я адразу прыму дозу! — сказаў Карлсан. — Добра дапамагае ад гарачкі.

— Я так не думаю, — сказаў Малы.

— Пойдзем у заклад? — прапанаваў Карлсан. — Стаўлю шакаладку, што маю рацыю.

Малы падумаў, што, мабыць, гэта мама і мела на ўвазе, калі казала, што ўсе спрэчкі можна вырашыць у разумнай гутарцы.

— Пойдзем у заклад? — паўтарыў Карлсан.

— Давай, — сказаў Малы.

Ён дастаў адну з дзвюх купленых шакаладак і паклаў на варштат, каб было бачна, на што яны закладаюцца. Потым намяшаў лекі паводле рэцэпта Карлсана: узяў кіслыя карамелькі, жэлейныя малінкі ды ірыскі і перамяшаў іх у кубку з роўнай колькасцю кавалачкаў шакаладу,

а потым дробна наламаў міндальнага печыва і пасыпаў крошкамі зверху. Такіх лекаў Малы ў жыцці ніколі не бачыў, але выглядалі яны так смачна, што ён сам захацеў крыху захварэць, каб пакаштаваць іх.

Але ў ложку сядзеў Карлсан, разявіўшы рот, быццам птушаня, і Малы паспяшаўся да яго з лыжкай.

— Загружай мне вялікую дозу, — сказаў Карлсан.

Малы так і зрабіў.

Потым яны проста сядзелі і чакалі, ці зменшыцца ў Карлсана тэмпература.

Праз паўхвіліны Карлсан сказаў:

— Твая праўда. Не дапамаглі яны ад тэмпературы. Давай мне шакаладку!

— Хіба *ты* мусіш атрымаць шакаладку? — здзівіўся Малы. — Перамог жа я.

— Калі ты ўжо і так перамог, дык няхай я хаця б шакаладку атрымаю, — сказаў Карлсан. — Нейкая справядлівасць мусіць жа быць у гэтым свеце. Дарэчы, а ты даволі жудасны хлопчык, раз хочаш сабе шакаладку толькі таму, што *ў мяне* гарачка.

Малы неахвотна падаў Карлсану шакаладку. Карлсан адразу ўпіўся ў яе зубамі і сказаў, жуючы:

— І без кіслых мін, папрашу. Наступным разам выйграю я, і шакаладку атрымаеш *ты*.

Ён працягваў заўзята жаваць, а калі праглынуў апошні кавалачак, то прылёг на падушкі і цяжка ўздыхнуў.

— Якія ж няшчасныя ўсе хворыя! — сказаў ён. — І я няшчасны! Вядома, можна паспрабаваць прыняць падвойную дозу кукарэкавых лекаў, але я ні на хвіліну не паверу, што яны дапамогуць.

— А я думаю, падвойная доза дапаможа, — паспешліва сказаў Малы. — Пойдзем у заклад?

Малы таксама ўмеў быць хітрым. Ён зусім не думаў, што тэмпературу можна збіць нават трайной дозай кукарэкавых лекаў, але яму вельмі хацелася прайграць. Бо ў яго засталася толькі адна шакаладка, і ён атрымае яе, калі Карлсан пераможа ў заклад.

— З вялікім задавальненнем, — сказаў Карлсан. — Замешвай падвойную дозу! Калі гаворка ідзе пра гарачку, спрабаваць трэба ўсё. Гэта адзінае, што мы можам рабіць, — спрабаваць і назіраць.

Малы намяшаў падвойную дозу і паклаў Карлсану ў прагна разяўлены рот. Карлсан пракаўтнуў лекі і ўсклікнуў:

— Здарыўся цуд! Гарачка сышла! Ты зноў перамог, давай сюды шакаладку!

Малы ўздыхнуў і аддаў яму апошнюю шакаладку. Карлсан паглядзеў на яго непрыязна.

— Такім капрызнікам, як ты, нельга ісці ў заклад, — сказаў ён. — Гэта могуць рабіць толькі такія, як я, што ззяюць заўжды, быццам сонейка, незалежна ад таго, перамаглі яны ці не.

Нейкі час было ціха, калі не лічыць чмякання, якое гучала, пакуль Карлсан жаваў сваю шакаладку. Потым ён сказаў:

— Але раз ужо ты такі ненажэрны хлопчык, то, пэўна, лепей за ўсё нам рэшту падзяліць па-братэрску. У цябе засталіся цукеркі?

Малы памацаў у кішэнях.

— Тры, — сказаў ён і дастаў дзве ірыскі і жэлейную малінку.

— Тры, — сказаў Карлсан. — Тры не дзеліцца, гэта і малыя дзеці ведаюць.

Ён узяў малінку з выцягнутай далоні Малога і спрытна яе праглынуў.

— А вось *цяпер* — дзеліцца, — сказаў ён.

Потым ён паглядзеў галоднымі вачыма на дзве ірыскі. Адна была крыху большая за другую.

— Я добры і сціплы, таму дазволю табе выбраць першым, — сказаў Карлсан. — Але ты, пэўна, ведаеш: хто выбірае першы, мусіць узяць сабе меншае, — дадаў ён і строга паглядзеў на Малога.

Малы ненадоўга задумаўся.

— Я хачу, каб *ты* выбіраў першы, — не разгубіўся ён.

— Ну хай сабе, калі ўжо ты такі ўпарты, — сказаў Карлсан, схапіў большую ірыску і адразу ж запхнуў яе ў рот.

Малы паглядзеў на дробную ірыску, што засталася ляжаць на яго далоні.

— Не, слухай, хіба ты не сказаў, што той, хто выбірае першы, мусіць узяць сабе меншае?

— Што не так, маленькі ты ласун? — сказаў Карлсан. — Калі б ты выбіраў першы, якую ірыску ты б узяў?

— Я б узяў меншую, праўда ўзяў бы, — сур'ёзна адказаў Малы.

— Ну дык чаго ты абураешся? — сказаў Карлсан. — Ты ж яе і атрымаў.

Малы зноў задумаўся, ці гэта мела мама на ўвазе пад «разумнай гутаркай».

Але Малы ніколі не бываў доўга без гумору. Што ні кажы, здорава, што ў Карлсана больш няма гарачкі. І Карлсан таксама так лічыў.

— Я напішу ўсім лекарам і раскажу, што дапамагае ад гарачкі. «Паспрабуйце кукарэкавыя лекі Карлсана, які жыве на даху», — вось што я ім напішу. Найлепшыя ў свеце лекі ад гарачкі!

Малы ўсё яшчэ не з'еў сваю ірыску. Яна здавалася такой цягучай, смачнай і цудоўнай, што ён хацеў спачатку ўволю на яе нагледзецца. А пачнеш яе есці — і ўсё, ірыскі ўжо няма!

Карлсан таксама глядзеў на ірыску Малога. Ён глядзеў на ірыску Малога доўга, а пасля нахіліў галаву набок і сказаў:

— Пойдзем у заклад, што я магу наваражыць, каб твая ірыска знікла, а ты нават не заўважыў?

— Дзе табе! — сказаў Малы. — Не зможаш, калі я буду трымаць яе ў руцэ і ўвесь час на яе глядзець.

— Дык што, ідзём у заклад? — спытаў Карлсан.

— Не, — сказаў Малы. — Я ведаю, што перамагу, і тады ірыска дастанецца табе...

Малы адчуваў, што гэта нейкі няправільны спосаб ісці ў заклад: з Бусэ і Бэтан яны рабілі гэта па-іншаму.

— Але мы можам пайсці ў заклад па-звычайнаму, па-сапраўднаму, каб ірыску атрымаў той, хто *перамо-жа*, — сказаў Малы.

— Як сабе хочаш, ненажэра, — сказаў Карлсан. — Ідзём у заклад, што я наваражу так, каб твая ірыска знікла, а ты нават не заўважыў!

— Давай! — сказаў Малы.

— Фокус-покус-філіёкус, — сказаў Карлсан і схапіў ірыску.

— Фокус-покус-філіёкус, — сказаў ён і засунуў яе ў рот.

— Стоп! — закрычаў Малы. — Я *дакладна* бачыў, як знікла ірыска!

— Няўжо? — сказаў Карлсан, хуценька глытаючы ірыску. — Значыць, ты зноў перамог. Ніколі не сустракаў такога хлопчыка, як ты, каб ён перамагаў ва ўсіх спрэчках!

— Так... але... ірыска, — збянтэжана сказаў Малы. — Той, хто перамог, мусіць атрымаць ірыску.

— Вядома, анягож, — сказаў Карлсан. — Але я наваражыў, каб ірыска знікла, і я іду ў заклад, што не змагу адваражыць яе назад.

Малы прамаўчаў, але вырашыў расказаць маме, як толькі яе ўбачыць, што разумныя гутаркі нічога не вартыя, калі трэба разабрацца, чыя праўда.

Ён пашнарыў у сваіх пустых кішэнях. Гэта ж трэба — там была яшчэ адна ірыска, якую ён раней не заўважыў! Вялікая, цягучая, цудоўная ірыска. Малы засмяяўся.

— Іду ў заклад, што ў мяне ёсць яшчэ адна ірыска, — сказаў Малы. — А яшчэ іду ў заклад, што я з'ем яе проста цяпер! — сказаў ён і спрытна засунуў ірыску ў рот.

Карлсан сеў на пасцель і паглядзеў спадылба.

— Ты мусіў быць для мяне як маці, — сказаў ён. — А табе толькі абы паболей напхаць за шчокі. Ніколі не бачыў такога ненажэрнага хлопчыка.

Ён крыху памаўчаў і спахмурнеў яшчэ больш.

— Дарэчы, я так і не атрымаў пяць эрэ за тое, што шалік казычацца, — сказаў ён.

— Але на табе і не было ніякага шаліка, — сказаў Малы.

— Проста ў мяне яго няма, — раздражнёна адказаў Карлсан. — Але калі б быў, то мы б ім павязалі мне шыю, і ён бы казытаўся, і тады я б атрымаў пяць эрэ.

Ён умольна паглядзеў на Малога. У яго вачах стаялі слёзы.

— Няўжо ты лічыш, што я мушу пакутаваць толькі таму, што ў мяне дома няма шаліка?

Малы так не лічыў. І ён аддаў Карлсану свой апошні пятак.

Карлсан хітруе

— Ацяпер я схільны крышачку пазабаўляцца, — праз нейкі час сказаў Карлсан. — Хадзем прагуляемся па дахах, тут заўсёды што-небудзь знойдзецца.

Малому прапанова дужа спадабалася. Ён узяў Карлсана за руку, яны выйшлі за дзверы і ступілі на дах. Ужо сутонела, і ўсё было вельмі прыгожае. Паветра было па-вясноваму блакітнае, і ўсе дамы здаваліся таямнічымі і загадкавымі, як гэта бывае ў прыцемках. Парк, дзе звычайна гуляў Малы, ззяў унізе дзівосным зялёным колерам, а з вялікай бальзамічнай таполі ў двары Малога ішоў чароўны водар, які сягаў самага даху.

Гэта быў цудоўны вечар для прагулак па дахах. Усе вокны былі адчыненыя, і было чуваць мноства розных гукаў і галасоў, гутаркі людзей, дзіцячы смех і дзіцячы плач. На кухні паблізу звінела парцаляна: нехта мыў посуд. Недзе скуголіў сабака, а дзесьці

яшчэ нехта брынкаў на піяніна. Унізе на вуліцы трашчаў матацыкл, і калі матор заціх, з'явіўся конь, які цягнуў павозку і грукаў капытамі, так што кожны ўдар далятаў наверх.

— Калі б людзі ведалі, як здорава на даху, то ўнізе на вуліцы нікога б не засталося, — сказаў Малы. — Ой, ну і весела ж тут!

— Так, аж дух займае, — сказаў Карлсан. — Бо так лёгка звaліцца. Я табе пакажу пару месцаў, дзе кожнага разу *амаль што* падаеш.

Дамы былі пабудаваныя так блізка адзін да аднаго, што можна было пераходзіць з даху на дах. Там было шмат дзіўных выступаў, мансардаў, комінаў, куткоў і закуточкаў — ніякае аднастайнасці. Дух сапраўды займала, як Карлсан і казаў, — акурат таму, што час ад часу ты *амаль што* падаў. У адным месцы паміж двума дамамі была вельмі шырокая прорва — вось там Малы амаль што звaліўся. Але Карлсан схапіў яго ў апошнюю хвіліну, калі адна нага Малога пераступіла ўжо за край даху.

— Здорава, скажы? — спытаў Карлсан, зацягваючы Малога на дах. — Вось такое я і меў на ўвазе. Зрабі так яшчэ раз!

Але Малы не захацеў рабіць так яшчэ раз. Для яго гэта было занадта «амаль што». Былі і іншыя

месцы, дзе даводзілася моцна чапляцца рукамі і нагамі, каб не зваліцца, а Карлсану хацелася, каб Малому было як мага весялей, таму ён не заўсёды выбіраў самую лёгкую дарогу.

— Трэба нахітраваць чаго-небудзь, — сказаў Карлсан. — Я звычайна гуляю па даху вечарамі і крыху падхітроўваю з людзей, што жывуць ва ўсіх вось гэтых мансардах.

— А як ты хітруеш? — пацікавіўся Малы.

— З рознымі людзьмі па-рознаму, вядома, — сказаў Карлсан. — Ніколі не раблю адной хітрасці двойчы. Найлепшы ў свеце хітрун — адгадай, хто гэта!

У гэты час зусім блізка ад іх закрычала малое дзіця. Малы чуў яго плач раней, але потым яно на нейкі час сціхла. Відаць, дзіця тады ненадоўга заснула. Але плач ізноў даносіўся з бліжняй мансарды і здаваўся вельмі жаласным і самотным.

— Небарака! — сказаў Малы. — Мабыць, яму прыхапіла жывоцік.

— Гэта мы хутка высветлім, — сказаў Карлсан. — Хадзі сюды!

Яны пакрочылі ўздоўж вадасцёкавай трубы, пакуль не прыйшлі пад самую мансарду. Тады Карлсан асцярожна прыўзняў галаву і зазірнуў усярэдзіну.

— Вельмі самотнае маленькае дзіця, — сказаў ён. — Мама з татам, відаць, бадзяюцца недзе, я так разумею.

Дзіця заплакала яшчэ жаласней, чым раней.

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Карлсан і забраўся на падаконне. — Вось ён я — Карлсан, які жыве на даху, найлепшы ў свеце нянь!

Малы не хацеў заставацца звонку адзін. Ён узлез на падаконне следам за Карлсанам, хоць і баяўся, што будзе, калі мама і тата дзіцяці раптоўна вернуцца.

Але Карлсан і не думаў турбавацца. Ён падышоў да ложачка, дзе ляжала дзіця, і пачухаў яго пульхным пальцам пад падбароддзем.

— Сюсі-пусі-плюцюцю, — гулліва сказаў ён.

Потым павярнуўся да Малога.

— Так трэба размаўляць з малюпасамі, ім гэта падабаецца!

Немаўля кінула плакаць ад аднаго здзіўлення, але, крыху апрытомнеўшы, завялося зноў.

— Сюсі-пусі... А пасля трэба зрабіць вось так, — сказаў Карлсан. Ён узяў дзіця з ложка і некалькі разоў падкінуў яго пад столь. Дзіцяці гэта, відаць, спадабалася, бо яно раптам заўсміхалася маленькай бяззубай усмешкай.

Карлсан зняў ад гонару.

— Няма нічога складанага ў тым, каб развесяліць дзіця, — сказаў ён. — Найлепшы ў свеце нянь... — далей ён сказаць не паспеў, бо дзіця зноў пачало плакаць.

— Сюсі-пусі-плюцюцю, — сярдзіта рыкнуў Карлсан і падкінуў яго пад столь мацней, чым калі. — Сюсі-пусі-плюцюцю, я сказаў, і гэта табе не жартачкі!

Дзіця крычала не сваім голасам, а Малы цягнуў да яго рукі.

— Дай, дай яе мне! — сказаў ён.

Яму вельмі падабаліся такія маленькія дзеткі, і ён не раз пытаў маму з татам, ці не падораць яны яму сястрычку, калі ўжо ніяк не хочуць дарыць сабаку.

Ён забраў у Карлсана ўкручанае ў пялюшкі дзіця і пяшчотна яго абняў.

— Не плач, калі ласачка, — сказаў ён.

Дзіця замаўчала і паглядзела на яго парай зусім бліскучых, сур'ёзных вачэй, потым усміхнулася зноў бяззубай усмешкай і ціха залапатала.

— Гэта мае сюсі-пусі падзейнічалі, — сказаў Карлсан. — Гэты прыём ніколі не хібіць, я спрабаваў ужо тысячу разоў.

— Цікава, як гэтае дзіця зваць? — сказаў Малы і пагладзіў яго пальцам па маленькай пяшчотнай шчацэ.

— Гуль-Фія, — сказаў Карлсан. — Так завуць большасць.

Малы ніколі не чуў, каб нейкае дзіця звалі Гуль-Фія, але падумаў, што найлепшы ў свеце нянь, пэўна ж, ведае лепей, як звычайна завуць дзяцей.

— Маленькая Гуль-Фія, — сказаў Малы. — Ты, напэўна, галодная.

Проста Гуль-Фія схапіла вуснамі яго палец, каб яго пасмактаць.

— Калі Гуль-Фія галодная, дык тут ёсць кілбаса ды бульба, — сказаў Карлсан, зазірнуўшы ў куток, дзе была кухня. — Дзеці не будуць гінуць з голаду, пакуль Карлсан у стане прыцягнуць з кухні кілбасу і бульбу.

Малы падумаў, што Гуль-Фія яшчэ не можа есці кілбасу з бульбай.

— Па-мойму, такім маленькім дзеткам трэба малако, — сказаў ён.

— Ты што, думаеш, найлепшы ў свеце нянь не ведае, што трэба, а што не трэба дзецям? — сказаў Карлсан. — Але няхай, я магу злятаць па карову!

Ён кінуў абураны позірк у акно.

— Толькі вось будзе складана зацягнуць рагулю праз такое дробненькае акенца.

Гуль-Фія адчайна шукала палец Малога і жаласна папісквала. Падобна, яна і праўда была галодная.

Малы зазірнуў у кухонны закуток, але малака там не знайшоў. Там ляжалі толькі тры лустачкі кілбасы на сподку.

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Карлсан. — Я акурат успомніў, дзе можна ўзяць малака. Я сам часам раблю адтуль глыток калі-нікалі. Бывай здароўценькі, хутка вярнуся!

Карлсан павярнуў круцёлку, што была ў яго на жываце, і — не паспеў Малы і вокам лыпнуць — з гудзеннем вылецеў у акно.

Малому зрабілася жах як страшна. А раптам Карлсана давядзецца чакаць гадзінамі, як звычайна бывала? А раптам мама і тата дзіцяці прыйдуць дадому і ўбачаць Малога з Гуль-Фіяй на руках?

Але доўга хвалявацца Малому не давялося. Гэтым разам Карлсан справіўся хутка. Горды, нібы певень, ён прагудзеў праз акно. У яго руцэ была бутэлечка з сусолкай, з якой звычайна п'юць маленькія дзеткі.

— Дзе ты яе дастаў? — здзівіўся Малы.

— У маім звычайным малочным месцы, — сказаў Карлсан. — На адным балконе ў Эстэрмальме.

— Ты яе *злямзіў*? — спалохана спытаў Малы.

— Я яе пазычыў, — сказаў Карлсан.

— Пазычыў... Калі ты збіраешся яе вярнуць? — спытаў Малы.

— Ніколі, — сказаў Карлсан.

Малы паглядзеў на яго строга, але Карлсан толькі адмахнуўся растапыранымі пальцамі:

— Маленькая бутэлечка малака — гэта з'ява банальная! У тых, у каго я пазычыў яе, — трайняты, і яны выстаўляюць на балкон у вёдрах з ільдом цэлую процьму такіх пляшак, і ім да таго ж *даспадобы*, што я бяру ў іх малако для Гуль-Фіі.

Гуль-Фія пацягнулася ручкамі да бутэлечкі і піскнула па-галоднаму.

— Я крыху яго падагрэю, — хутка сказаў Малы і перадаў Гуль-Фію Карлсану.

— Сюсі-пусі-плюцюцю! — закрычаў ён і пачаў падкідваць Гуль-Фію пад столь, пакуль Малы падаграваў малако.

Неўзабаве Гуль-Фія ляжала ў сваім ложачку і спала, нібы анёлак. Яна была сытая і задаволеная.

Малы ўвесь час папраўляў ёй коўдрачку, а Карлсан казытаў пальцам і крычаў «сюсі-пусі», але Гуль-Фія ўсё адно заснула, бо была сытая і вельмі стамілася.

— А цяпер давай пахітруем, перад тым як сысці, — сказаў Карлсан.

Ён прынёс халодныя лустачкі кілбасы. Малы паглядзеў на іх вялікімі вачыма.

— Зараз ты пабачыш хітрунства! — сказаў Карлсан і павесіў адну лустачку на ручку дзвярэй, што вялі ў куханьку.

— Нумар адзін, — сказаў ён і задаволена кіўнуў. Потым шпаркімі крокамі падышоў да камоды. Там стаяла прыгожая белая парцалянавая галубка. Не паспеў Малы вымавіць і слова, як тая атрымала кавалачак кілбасы ў дзюбу.

— Нумар два, — сказаў Карлсан. — А нумар тры атрымае Гуль-Фія.

Ён насунуў скрылёк кілбасы на маленькую палачку і ўклаў яе ў руку соннай Гуль-Фіі. Выглядала гэта

вельмі смешна. Можна было падумаць, што Гуль-Фія сама ўзяла тую кілбасу, а потым так і заснула, але Малы ўсё ж папрасіў:

— Не, не трэба гэтага, калі ласка!

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Карлсан. — Гэта адвучыць яе маму і тату бадзяцца ўвечары невядома дзе.

— Як гэта? — спытаў Малы.

— Дзіця, якое можа само пайсці і ўзяць сабе кілбасы, яны адно не пакінуць. Бо хто ведае, што яно прыдумае наступным разам... Можа, возьме татава нядзельнае піва.

Карлсан паправіў палачку з кілбасой у кволай руцэ Гуль-Фіі.

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў ён. — Я, нябось, ведаю, што раблю, я ж найлепшы ў свеце нянь!

Тут Малы пачуў крокі на сходах і аж уздрыгнуў ад спалоху.

— Вой, ідуць! — прашаптаў ён.

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Карлсан, і яны абодва кінуліся да акна. Малы пачуў, як у замочную шчыліну ўставілі ключ, і падумаў, што ўсё — прапаў, але неяк усё ж паспеў пераваліцца праз падаконне. Праз секунду ён пачуў, як адчыніліся дзверы і нечы голас сказаў:

— Ах, маміна Сюзаначка, спіць сабе і спіць!

— Так, усё спіць ды спіць, — сказаў іншы голас.

Але потым пачуўся крык. І Малы зразумеў: мама і тата Гуль-Фіі заўважылі кілбасу.

Ён не застаўся чакаць працягу, а скачкамі дагнаў найлепшага ў свеце няня, які акурат хаваўся за комінам.

— Хочаш паглядзець на парачку бандзюганаў? — спытаў Карлсан, калі яны крыху адпачылі. — У мяне тут у адной мансардзе ёсць два першакласныя бандзюганы.

Гучала так, нібыта бандзюганы былі Карлсанавы ўласныя. Вядома, гэта было не так, але Малому ўсё адно захацелася на іх паглядзець.

З мансарды бандзюганаў чуліся гутарка, смех і шум.

— Гумор і весялосць, — сказаў Карлсан. — Хадзем паглядзім, што там за свята.

Яны пракраліся ўздоўж вадасцёкавай трубы, Карлсан прыўзняўся і зазірнуў усярэдзіну. На акне віселі фіранкі, але паміж імі была шчыліна, у якую можна было зазірнуць.

— У бандзюганаў нейкі госць, — прашаптаў Карлсан.

Малы таксама зазірнуў у акно. У пакоі сядзелі два тыпусы, якія дакладна мусілі быць бандзюганамі, а яшчэ нейкі маленькі, лагодны, рахманы дзядзечка,

які выглядаў так, быццам прыехаў з вёскі, дзе жыла бабуля Малога.

— Ведаеш, што я думаю? — прашаптаў Карлсан. — Я думаю, што гэтыя бандзюганы самі там нешта хітруюць. Але нічога ў іх не выйдзе!

Ён яшчэ раз зазірнуў у пакой.

— Я не я, калі яны не хочуць абхітрыць гэтага небараку ў чырвоным гальштуку, — прашаптаў ён Малому.

Бандзюганы і той дзядзечка ў чырвоным гальштуку сядзелі за столікам каля самага акна. Яны елі і пілі, бандзюганы па-сяброўску паляпвалі дзядзечку ў чырвоным гальштуку па плячы і казалі:

— Як здорава, што мы сустрэлі цябе, дружа Оскар!

— І мне прыемна, што я вас сустрэў, — сказаў Оскар. — Калі вось так прыязджаеш у горад, дык хочацца завесці добрых сяброў, такіх, каб надзейныя былі. Іначай не ведаеш, на што натрапіш. Гэта ж і махляры якія могуць сустрэцца!

Бандзюганы заківалі.

— Вось-вось, можна натрапіць на махляроў! — сказаў адзін. — Якое шчасце, што ты сустрэў Філе і мяне!

— Так, калі б ты не сустрэў Руле і мяне, з табой магла б здарыцца сапраўдная бяда, — сказаў другі.

— Ну а цяпер еш, пі і атрымлівай задавальненне! — сказаў той, якога звалі Філе, і зноў паляпаў Оскара па плячы.

Але потым ён зрабіў нешта, што неверагодна здзівіла Малога. Філе нібы зусім выпадкова засунуў руку ў заднюю кішэню Оскаравых штаноў і вывудзіў адтуль гаманец, які акуратна паклаў у заднюю кішэню сваіх уласных штаноў. А Оскар нічога не заўважыў. Напэўна, таму, што Руле акурат павіс у яго на шыі і ляпаў яго па плячы. Але калі Руле наляпаўся і адняў ад яго сваю руку, то ў ёй выпадкова апынуўся Оскараў гадзіннік. Руле запхнуў яго сабе ў заднюю кішэню штаноў, а Оскар нічога не заўважыў.

Але потым Карлсан асцярожна прасунуў пульхную ручку праз шчыліну між фіранкамі і выцягнуў гаманец з задняй кішэні штаноў Філе, і той нічога не заўважыў. Тады Карлсан выцягнуў руку і дастаў гадзіннік з задняй кішэні штаноў Руле, і той таксама нічога не заўважыў.

Праз нейкі час, калі Руле, Філе і Оскар пад'елі і выпілі яшчэ больш, Філе засунуў руку ў сваю заднюю кішэню і зразумеў, што гаманца там няма. Тады ён злосна ўперыўся ў Руле і сказаў:

— Слухай, Руле, давай выйдзем у вітальню, мне трэба нешта табе сказаць.

Тут Руле акурат памацаў у сваёй задняй кішэні і заўважыў, што гадзіннік знік. Ён таксама злосна ўперыўся ў Філе і сказаў:

— Выдатна, бо мне таксама трэба нештачка табе сказаць!

Філе і Руле выйшлі ў вітальню, а няшчасны Оскар застаўся адзін. Яму гэта, відаць, здалося сумным, бо неўзабаве ён падняўся і таксама выйшаў у вітальню, каб паглядзець, куды прапалі Філе і Руле. Тады Карлсан спрытна пералез праз акно і паклаў Оскараў гаманец у міску з-пад супу. Філе, Руле і Оскар ужо даелі суп, так што гаманец не намок. Оскараў гадзіннік Карлсан павесіў боўтацца на люстры — і гэта было першае, што пабачылі Оскар, Філе і Руле, калі вярнуліся з вітальні. А Карлсана яны не заўважылі, таму што ён запоўз пад стол, абрус на якім звісаў да самай падлогі. Пад сталом ужо сядзеў і Малы, бо хацеў быць побач з Карлсанам, нават калі там вусцішна.

— Гляньце, мой гадзіннік вісіць! — сказаў Оскар. — Як гэта ён туды трапіў?

Оскар падышоў да люстры, зняў гадзіннік і паклаў у кішэню курткі.

— Нічога сабе — а тут мой гаманец! — сказаў ён, зазірнуўшы ў міску. — Як дзіўна!

Руле і Філе з пашанай паглядзелі на Оскара, і Філе сказаў:

— А вы там у вёсцы таксама не лыкам шытыя, я гляджу.

Потым Руле, Філе і Оскар зноў селі за столік.

— Дружа Оскар, ты мусіш яшчэ крыху пад'есці і выпіць, — сказаў Філе.

Оскар, Філе і Руле зноў елі, пілі і паляпвалі адзін аднаго па плячах. Праз нейкі час рука Філе прасунулася пад абрус і асцярожна паклала гаманец Оскара на падлогу. Напэўна, Філе падумаў, што там больш надзейнае месца, чым у яго най кішэні. Але ён памыліўся, бо Карлсан адразу схапіў гаманец і падаў яго Руле, а Руле ўзяў гаманец і сказаў:

— Філе, я кепска думаў пра цябе, а насамрэч ты годны чалавек.

Праз нейкі час пад абрус прасунулася рука Руле і асцярожна паклала на падлогу гадзіннік Оскара. Карлсан узяў гадзіннік, асцярожна пашкроб Філе па назе і падаў яму гадзіннік. Філе сказаў:

— Лепшага сябра, чым ты, Руле, не знайсці!

Але неўзабаве Оскар спытаў:

— Дзе мой гаманец? І дзе мой гадзіннік?

І тады гаманец і гадзіннік маланкава паляцелі пад стол, бо Філе не хацеў мець пры сабе гадзінні-

ка, а Руле — гаманца, калі Оскар надумае ўсчыніць сварку. А Оскар і праўда пачаў досыць гучна сварыцца і патрабаваць назад свой гадзіннік і свой гаманец, на што Філе сказаў:

— Адкуль нам ведаць, дзе ты пасеяў свой няшчасны гаманец?!

А Руле дадаў:

— Не бачылі мы твайго няшчаснага гадзінніка. Сачыць трэба за сваімі рэчамі!

Але тут Карлсан узяў спачатку гаманец, а потым гадзіннік і ўсунуў іх у рукі Оскару, а той схаваў абедзве рэчы ў кішэні і сказаў:

— Дзякуй, дружа Філе, дзякуй, Руле. Але другім разам так са мной не жартуйце.

А потым Карлсан штурхануў Філе ў нагу з усёй сілы, і Філе ўскрыкнуў:

— Ты за гэта заплаціш, Руле!

Тады Карлсан штурхануў Руле ў нагу з усёй сілы, і Руле ўскрыкнуў:

— Ты здурнеў, Філе? Чаго брыкаешся?

Руле і Філе ўскочылі і кінуліся біцца, ажно ўсе талеркі паляцелі са стала на падлогу і паразбіваліся, а Оскар спалохаўся ды сышоў са сваімі гаманцом і гадзіннікам і ўжо назад не вярнуўся.

Малы таксама спалохаўся, але сысці не мог, а мусіў сядзець ціха і нерухома пад сталом.

Філе быў мацнейшы за Руле, ён выгнаў Руле ў вітальню і пагнаўся следам за ім, каб яшчэ больш аддубасіць. Тады Карлсан і Малы вылезлі з-пад стала, паглядзелі на разбітыя талеркі, што валяліся па ўсёй падлозе, і Карлсан сказаў:

— Нашто місцы быць цэлай, калі ўсе талеркі пабітыя? Ёй будзе самотна адной, няшчаснай місачцы!

І ён гучна грымнуў міскай аб падлогу, а потым кінуўся з Малым да акна, і яны спрытна вылезлі вонкі. Тады Малы пачуў, як Філе і Руле вяртаюцца ў пакой і Філе кажа:

— Якога ляда ты аддаў яму гадзіннік і гаманец, дурны ты селядзец?

— У цябе што, клёку не стала? — сказаў Руле. — Гэта ж *ты* яму аддаў.

Тады Карлсан зарагатаў так, што жывот захадзіў ходарам, а пасля сказаў:

— Усё, сёння хітраваць больш не буду.

Малы таксама адчуваў, што хітравання на сёння досыць.

Было ўжо даволі цёмна, і Малы з Карлсанам узяліся за рукі ды пайшлі дахамі назад да Карлсанавага дамка. Калі яны туды вярнуліся, то пачулі сірэну пажарнай машыны, што неслася па вуліцы.

— Недзе пажар, вось пабачыш, — сказаў Малы. — Вунь пажарныя едуць.

— А раптам пажар у гэтым самым доме! — з надзеяй сказаў Карлсан. — Тады хай толькі

скажуць мне, і я ім дапамагу, бо я найлепшы ў свеце тушыльнік пажараў.

Ім было бачна, што пажарная машына спынілася пад самым домам, а вакол сабралася куча народу. Але агню нідзе не было. Затое да даху раптам пачалі выязджаць драбіны — такія доўгія, высоўныя, якія бываюць на пажарных машынах.

Тут Малы задумаўся.

— А што, калі... А што, калі... яны прыехалі, каб зняць мяне адсюль? — сказаў ён.

Бо раптам успомніў пра запіску, якую пакінуў у сваім пакоі. А час быў ужо даволі позні.

— З чаго б гэта, скажы ты мне? — сказаў Карлсан. — Хто ж будзе супраць, што ты крыху пагуляеш на даху?

— Ну, мая мама, магчыма, — сказаў Малы. — У яе такія нервы, што яны ўвесь час вымотваюцца.

Яму зрабілася так шкада мамы, калі ён пра гэта падумаў... Ён адразу па ёй засумаваў.

— Можна было б крыху пахітраваць з пажарных, — прапанаваў Карлсан.

Але Малы не хацеў болей хітраваць. Ён стаяў нерухома і чакаў пажарнага, які лез па драбінах.

— Ну няхай, — сказаў Карлсан. — Мне і самому, пэўна, час ісці класціся. Мы, вядома, так і не

пахітравалі як след, але не варта забывацца, што ў мяне зранку была тэмпература самае меншае градусаў трыццаць-сорак!

І ён паскакаў па даху прэч.

— Бывай здароўценькі, Малы! — крыкнуў ён.

— Бывай здароўценькі, Карлсан! — крыкнуў Малы.

Але ўвесь час ён глядзеў на пажарнага, які ўсё набліжаўся.

— Гэй, Малы! — гукнуў Карлсан, перш чым знік за комінам. — Не кажы пажарным, што я тут. Я ж найлепшы ў свеце тушыльнік пажараў — толькі і чакай, што потым пачнуцца бясконцыя ўпрошванні, каб я дапамог, як толькі недзе загарыцца.

Пажарны быў ужо блізка.

— Стой ціха дзе стаіш, — крыкнуў ён Малому. — Нікуды не рухайся, я зараз цябе здыму.

Малы падумаў, што гэта міла з яго боку, але залішне. Малы ж увесь вечар толькі і рабіў, што вандраваў па даху — яшчэ пару крокаў ён бы, нябось, здолеў зрабіць.

— Цябе мая мама паклікала? — спытаў ён, калі пажарны спускаўся з ім па драбінах.

— Яна, а ты як думаў? — сказаў пажарны. — Дарэчы... У нейкі міг мне амаль падалося, што на даху было *двое* хлопчыкаў...

Малы ўспомніў, пра што прасіў яго Карлсан, і сур'ёзна адказаў:

— Не, *хлопчык* там быў толькі адзін — я.

У мамы і праўда выматаліся нервы. Яна разам з татам, Бусэ, Бэтан і кучай іншых людзей стаяла

на вуліцы і чакала Малога. Мама кінулася да яго, абняла і то плакала, то смяялася. А тата пранёс яго на руках да самай кватэры і ўвесь час моцна туліў да сябе. А Бусэ сказаў:

— Ты нас да смерці перапалохаў, Малы.

А Бэтан дык таксама заплакала і сказала:

— Ніколі так больш не рабі, запомні гэта!

Калі Малы крыху пазней ляжаў у сваім ложку, усе сабраліся вакол яго, нібы гэта быў ягоны дзень народзінаў. Але тата сказаў вельмі сур'ёзна:

— Хіба ты не разумеў, што мы будзем хвалявацца? Хіба не разумеў, што мама будзе плакаць і бедаваць?

Малы павярнуўся ў ложку.

— Чаго вам было хвалявацца?.. — прамармытаў ён.

Мама моцна-моцна абняла яго і сказала:

— А раптам бы ты ўпаў! А раптам бы мы цябе страцілі!

— А што, вы б тады шкадавалі? — з надзеяй спытаў Малы.

— Вядома, яшчэ пытаеш! — сказала мама. — Мы ні за якія грошы ў свеце не захочам з табой расстацца, ты ж гэта ведаеш сам.

— Што, нават за сто тысяч мільёнаў крон? — спытаў Малы.

— Нават за сто тысяч мільёнаў крон!

— Гэта я столькі каштую? — здзівіўся Малы.

— Ну а як жа! — сказала мама і зноў абняла яго.

Малы задумаўся. Сто тысяч мільёнаў крон — гэта ж шалёная куча грошай! Няўжо ён і праўда столькі каштуе? І гэта пры тым, што купіць шчаня — сапраўднае цудоўнае шчаня — можна за нейкія дзве сотні крон!

— Слухай, тата, — сказаў Малы, паразважаўшы як след. — Калі я каштую сто тысяч мільёнаў крон, то мне ж можна атрымаць дзвесце з іх на рукі, каб купіць сабачку?

Карлсан гуляе ў прывіда

Толькі на наступны дзень за абедам яны пачалі распытваць Малога, як ён змог трапіць на дах.

— Ты пралез праз акенца на гарышчы? — спытала мама.

— Не, я туды *прыляцеў* — разам з Карлсанам, які жыве на даху, — сказаў Малы.

Мама і тата пераглянуліся.

— Не, так больш не можа працягвацца, — сказала мама. — Я звар'яцею ад гэтага Карлсана.

— Малы, Карлсана *не існуе*, — сказаў тата.

— Не існуе! — сказаў Малы. — Учора, прынамсі, ён яшчэ існаваў.

Мама пахітала галавой.

— Добра, што школа хутка скончыцца і ты паедзеш да бабулі, — сказала яна. — Спадзяюся, туды Карлсан за табой следам не паляціць.

Пра гэтую акалічнасць Малы зусім забыўся. На лета яго адпраўляць да бабулі, і два месяцы ён не зможа бачыцца з Карлсанам. Не тое каб у бабулі яму не падабалася. Там заўжды было вельмі весела, але ж — ах! — як ён будзе сумаваць без Карлсана! А раптам, калі ён вернецца, Карлсана ўжо не будзе на іхнім даху!

Малы паставіў локці на стол, падпёр галаву рукамі і паспрабаваў уявіць, якім будзе ягонае жыццё без Карлсана.

— Прыбяры локці са стала, ведаеш жа, што нельга, — сказала Бэтан.

— Не твой клопат, — агрызнуўся Малы.

— Не стаў локці на стол, Малы, — сказала мама. — Хочаш яшчэ квяцістай капусты?

— Не ўжо, лепей памерці, — сказаў Малы.

— Фу, брыдка так казаць, — сказаў тата. — Трэба казаць: «Не, дзякуй».

«Вось як яны раскамандаваліся статысячамільённакронавым дзіцём», — падумаў Малы, але не сказаў так. Замест гэтага ён патлумачыў:

— Калі я кажу «лепей памерці», дык вам жа і так ясна, што я маю на ўвазе «не, дзякуй».

— Але джэнтльмены так не кажуць, — заўпарціўся тата. — А ты ж хочаш быць джэнтльменам, Малы?

— Не ўжо, я лепш хачу быць такім як ты, тата, — сказаў Малы.

Мама, Бусэ і Бэтан засмяяліся. Малы не зразумеў, чаму, але падумаў, што яны смяюцца з таты. І гэта яму не спадабалася.

— Я хачу быць такім, як ты, тата, — проста добрым, — сказаў ён, лагодна гледзячы на бацьку.

— Дзякуй, сынку, — сказаў тата. — Дык што, ты праўда не хочаш болей капусты?

— Не ўжо, лепей памерці, — сказаў Малы.

— Але яна карысная, — сказала мама.

— Так я і думаў, — сказаў Малы. — Усё самае нясмачнае чамусьці лічыцца самым карысным. І чаго яны пхаюць усе вітаміны ва ўсё нясмачнае, хацеў бы я ведаць!

— Сапраўды, дзіўна, — сказаў Бусэ. — Па-твойму ж вітаміны мусяць быць у жуйцы ды ірысках, праўда?

— Гэта самае разумнае, што я чуў ад цябе за апошні час, — сказаў Малы.

Паабедаўшы, ён пайшоў у свой пакой. Ён усім сэрцам спадзяваўся, што Карлсан прыляціць. Малы ж павінен з'ехаць на канікулы, і яму хацелася паспець насустракацца з Карлсанам як мага больш.

Напэўна, Карлсан адчуў гэта, бо заляцеў у пакой, як толькі Малы высунуў нос з акна.

— Як ты сёння, без гарачкі? — спытаў Малы.

— Гарачка... у мяне? — перапытаў Карлсан. — У мяне ніколі не было ніякай гарачкі. Гэта была толькі прыдумка.

— Ты проста прыдумаў, што ў цябе была тэмпература? — здзівіўся Малы.

— Не, я проста прымусіў цябе думаць, нібыта ў мяне гарачка, — сказаў Карлсан і задаволена засмяяўся. — Найлепшы ў свеце хітрун — здагадайся, хто ён!

Карлсан ні секунды не стаяў спакойна. Увесь час, пакуль размаўляў, ён шнарыўся па пакоі і цікаўна мацаў усё, адчыняў усе шафы і шуфлядкі, да якіх мог дабрацца, і даследаваў усё з найвялікшым інтарэсам.

— Не, сёння ў мяне няма гарачкі, — сказаў ён. — Сёння я каласальна здаровы і схільны пазабаўляцца.

Малы таксама быў схільны пазабаўляцца. Але перш за ўсё ён хацеў, каб мама, тата, Бусэ і Бэтан пабачылі Карлсана і спынілі балбатню пра тое, што яго не існуе.

— Пачакай крышку, — паспешліва сказаў ён. — Я зараз вярнуся.

Ён кінуўся ў гасцёўню. Бусэ і Бэтан толькі-толькі сышлі. Гэта было жахліва, але затое мама з татам сядзелі там, і Малы ўзрушана сказаў:

— Мама, тата, ідзіце хутчэй да мяне ў пакой!

Ён не наважыўся згадаць пра Карлсана. Будзе лепш, калі яны ўбачаць яго без папярэджання.

— Можа, лепей хадзі ты пасядзі з намі? — прапанавала мама.

Але Малы пацягнуў яе за руку.

— Не, хадземце вы да мяне, я вам нешта пакажу.

Нарэшце яны згадзіліся, ён павёў бацькоў за сабою і, радасны і шчаслівы, адчыніў дзверы ў пакой. Нарэшце яны пабачаць!

Ад расчаравання ён ледзь не заплакаў. Пакой быў пусты — зусім як мінулым разам, калі ён збіраўся паказаць Карлсана.

— Што ты хацеў нам паказаць? — спытаў тата.

— Ды нічога, — прамармытаў Малы.

На шчасце, тут зазваніў тэлефон, і яму не давялося нічога тлумачыць. Тата пайшоў адказваць. А ў мамы ў духоўцы стаяў шакаладны пірог, і яго трэба было пільнаваць. Малы застаўся адзін. Ён сеў каля акна, злы-злы на Карлсана, і вырашыў выказаць яму ўсё, хай толькі прыляціць ізноў!

Але ніхто не прыляцеў. Замест гэтага адчынілася шафа, і адтуль высунуўся задаволены твар Карлсана.

Малы страшэнна здзівіўся.

— Што ты там рабіў, у маёй шафе? — спытаўся ён.

— Выседжваў яйкі... Не! Думаў над сваімі грахамі... Не! Валяўся на паліцы... Так! — сказаў Карлсан.

Малы забыўся на сваю крыўду. Ён проста радаваўся, што Карлсан знайшоўся.

— Гэта вельмі добрая шафа для гульні ў хованкі, — сказаў Карлсан. — Давай згуляем! Я зноў лягу на паліцу, а ты адгадвай, дзе я.

Не паспеў Малы адказаць, а Карлсан ужо знік у шафе. Малы пачуў, як той караскаецца на паліцу.

— Можаш шукаць! — крыкнуў Карлсан.

Малы расчыніў шафу і адразу знайшоў Карлсана на паліцы.

— Фу-фу, які ты гадкі! — уклікнуў Карлсан. — Ты ж мог бы пашукаць у ложку, ці за сталом, ці яшчэ дзе-небудзь *для пачатку*. Я з табой не гуляю, калі ты так! Фу, які гадкі!

Тут акурат у дзверы пазванілі, а следам з вітальні пачуўся голас мамы:

— Малы, да цябе Крыстэр і Гуніла прыйшлі!

Большага было і не трэба, каб да Карлсана вярнуўся добры настрой.

— Мы з іх пахітруем, — прашаптаў ён Малому. — Зачыні за мной дзверы!

Малы зачыніў шафу. І толькі ён гэта зрабіў, як у пакой зайшлі Гуніла і Крыстэр. Яны жылі на той

самай вуліцы і хадзілі ў той самы клас, што і Малы. Малому вельмі падабалася Гуніла, ён часта расказваў маме, якая яна «фенаменальна цудоўная». Крыстэр таксама яму падабаўся: Малы ўжо выбачыў яму той гузак на лбе. Бойкі здараліся ў іх даволі часта, але потым хлопцы заўсёды мірыліся і заставаліся такімі ж добрымі сябрамі. Дарэчы, Малы біўся не толькі з Крыстэрам — ён удзельнічаў у дзікіх баталіях амаль з усімі дзецьмі з яго вуліцы. Але Гунілу не чапаў.

— І як гэта ты яшчэ не дабраўся пабіцца з Гунілай? — аднойчы спытала ў яго мама.

— Ну, яна такая фенаменальна цудоўная, што ў гэтым няма патрэбы, — адказаў Малы.

Але Гуніла, вядома, таксама часам магла дражніцца. Учора, калі яны вярталіся са школы, Малы расказаў пра Карлсана, які жыве на даху, і Гуніла тады засмяялася і сказала, што Карлсан — гэта проста выдумка. Крыстэр з ёй пагадзіўся, і Малому давялося даць яму пстрычку, і вось акурат тады Крыстэр і кінуў камень у лабешнік Малому.

Але цяпер яны прыйшлі да яго, і Крыстэр узяў з сабой Ёфу. Убачыўшы яго, Малы зусім забыўся пра Карлсана, што ляжаў на паліцы ў шафе. Ён лічыў, што сабакі — самае цудоўнае, што бывае на свеце. Ёфа скакаў і брахаў, а Малы абдымаў яго за шыю і гладзіў. Крыстэр стаяў побач і спакойна назіраў

за гэтым. Ён жа ведаў, што Ёфа — ягоны сабака, а не чыйсьці яшчэ, так што Малы мог гладзіць яго колькі душа папросіць.

Якраз калі Малы ўвесь быў заняты Ёфам, Гуніла сказала з задзірлівым смяшком:

— А дзе твой няшчасны Карлсан, які жыве на даху? Мы думалі, ён будзе з табой.

Толькі тут Малы ўспомніў, што Карлсан ляжыць на паліцы ў шафе. Але ён не ведаў, ці можна пра гэта расказваць, бо Карлсан жа хацеў неяк пахітраваць. Таму ён толькі сказаў:

— П-ф-ф, ты ж кажаш, што Карлсана не бывае. Ты сказала ўчора, што ён выдумка.

— І гэта праўда! — адказала Гуніла і засмяялася так, што на шчоках выступілі ямінкі.

— А вось ён і не выдумка! — сказаў Малы.

— Ды выдумка ён, — сказаў Крыстэр.

— А вось і не! — сказаў Малы.

Ён паразважаў, ці варта пашукаць якую-небудзь зачэпку, каб працягнуць гэтую «разумную гутарку», або лепей адразу надаваць Крыстэру кухталёў. Але да таго, як ён паспеў нешта вырашыць, з шафы пачулася гучнае, пранізлівае кукарэканне.

— Гэта *што*? — сказала Гуніла, і яе раток, маленькі і чырвоны, як вішня, раскрыўся ад здзіўлення.

— Кукарэку! — пачулася зноў, і прагучала гэта, нібы кукарэкаў сапраўдны певень.

— У цябе ў шафе *певень*? — агаломшана запытаў Крыстэр.

Ёфа загыркаў. А Малы засмяяўся, ды так, што слова не мог вымавіць ад смеху.

— Кукарэку! — пачулася з шафы.

— Я адчыню пагляджу, — сказала Гуніла.

Яна адчыніла шафу і зазірнула ўнутр. Крыстэр падбег і зазірнуў таксама. Спачатку яны не ўбачылі нічога, апрача кучы адзення. Але потым яны пачулі зверху хіхіканне і калі паглядзелі туды, то ўбачылі маленькага таўсматага дзядзечку, які ляжаў на паліцы. Ён ёмка ўладкаваўся, абапёршыся на адзін локаць, і пабоўтваў пульхнай ножкай. Яго вясёлыя блакітныя вочкі ззялі.

Ні Гуніла, ні Крыстэр спачатку не маглі вымавіць ні слова, толькі Ёфа гырчаў. Але калі да Гунілы вярнулася мова, яна сказала:

— Гэта *хто*?

— Проста маленькая выдумка, — сказаў дзіўны тыпус на верхняй паліцы і яшчэ больш задрыгаў нагой. — Маленечкая такая выдумка, якая проста ляжыць і адпачывае. Карацей кажучы... Мяне не бывае!

— Гэта... гэта... — пачаў запінацца Крыстэр.

— Маленькая выдумка, якая проста валяецца тут ды кукарэкае ва ўсёй сваёй святой прастаце, — сказаў дзядзечка.

— Гэта Карлсан, які жыве на даху? — прашаптала Гуніла.

— Так, а ты што думала? — сказаў Карлсан. — Ты, можа, думала, што гэта спадарыня Густафсан з дзевяноста другой кватэры прабралася сюды і скруцілася абаранкам?

Малы адно рагатаў, бо Гуніла і Крыстэр так і пасталі, разявіўшы раты, — ну і твары ў іх былі!

— Ну што, з'елі? — сказаў урэшце Малы.

Карлсан саскочыў з паліцы. Ён падышоў да Гуніны і гарэзліва ўшчыкнуў яе за шчаку.

— А гэта што за маленькая дзяціная выдумка? — спытаў ён.

— Мы... — пачаў Крыстэр.

— Як тваё прозвішча, Аўгуст? — спытаў Карлсан.

— Я не Аўгуст, — сказаў Крыстэр.

— Іх завуць Гуніла і Крыстэр, — сказаў Малы.

— Сапраўды, чаго толькі з людзьмі не здараецца! — сказаў Карлсан. — Але не засмучайцеся праз гэта, не трэба... На жаль, не могуць усе звацца Карлсанамі.

Ён з цікаўнасцю агледзеўся і, не перавёўшы дыху, загаварыў далей:

— Я схільны крыху пазабаўляцца. Можа, пакідаем крэслы з акна ці яшчэ што-небудзь?

Малому не дужа спадабалася такая ідэя, і ён быў упэўнены, што мама з татам таксама не ацэняць.

— Ну, калі яны такія старамодныя, то хай сабе, — сказаў Карлсан, — нічога тут не зробіш. Тады давядзецца прыдумаць штосьці яшчэ, бо пазабаўляцца я мушу. А інакш я з вамі не гуляю, — сказаў ён і пакрыўджана закапыліў губу.

— Вядома ж, мы нешта прыдумаем! — прымірэнча сказаў Малы.

Але было відаць, што Карлсан вырашыў крыўдзіцца.

— Толькі сцеражыцеся, каб я зноў ад вас не паляцеў, — сказаў ён.

І Малы, і Крыстэр, і Гуніла — усе разумелі, якая гэта была б бяда, таму яны кінуліся прасіць і маліць Карлсана застацца.

Карлсан пасядзеў яшчэ крыху з даволі пакрыўджаным тварам.

— Гэта не дакладна, — сказаў ён урэшце, — але *можа быць* я застануся, калі вунь яна пагладзіць мяне і скажа: «Мілы Карлсан!» — сказаў ён і паказаў маленькім тоўсценькім пальчыкам на Гунілу.

І Гуніла хуценька падбегла яго пагладзіць.

— Мілы Карлсан, застанься, і мы прыдумаем якую-небудзь забаву, — сказала яна.

— Ну добра, тады я застануся, — сказаў Карлсан, і дзеці з палёгкай выдыхнулі.

Але зарана.

Мама і тата Малога калі-нікалі хадзілі на вечаровую прагулку. Вось і цяпер мама крыкнула з вітальні:

— Мы пойдзем прагуляемся! Крыстэр і Гуніла могуць заставацца да васьмі, а ты пасля адразу гэць у ложак, Малы. Я потым зайду сказаць табе дабранач.

І яны пачулі, як у калідоры грукнулі дзверы.

— Яна не сказала, колькі можна заставацца *мне*, — сказаў Карлсан і закапыліў губу. — Я з вамі не гуляю, калі ўсё так несправядліва.

— Ты можаш заставацца колькі захочаш, — сказаў Малы.

Карлсан закапыліў губу яшчэ больш.

— Чаму мяне не выганяюць а восьмай, як іншых? — сказаў ён. — Я з вамі не гуляю…

— Я папрашу маму, каб яна выставіла цябе а восьмай, — паспешліва сказаў Малы. — Якую б забаву нам прыдумаць, як лічыш?

Раптам кепскі настрой Карлсана як ветрам здзьмула.

— Можам пагуляцца ў прывіда і перапалохаць народ да смерці! — сказаў ён. — Вы не ўяўляеце, што я магу зрабіць з дапамогай адной толькі маленькай прасціны. Калі б мне плацілі пяць эрэ за кожнага, каго я напужаю да смерці, — вось бы я ірысак тады накупіў! Я найлепшы ў свеце прывід, — сказаў Карлсан, і вочы яго заззялі весела-весела.

Малы, Крыстэр і Гуніла вельмі хацелі пагуляць у прывіда, але Малы сказаў:

— Але так страшна пужаць людзей усё ж не трэба!

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Карлсан. — Не трэба вучыць найлепшага ў свеце прывіда, як палохаць і як не. Я спужаю іх да смерці толькі *трошкі*, яны амаль нічога і не заўважаць.

Карлсан падышоў да ложка Малога і сцягнуў прасціну.

— З гэтага атрымаецца міленькі прывідны касцюмчык, — сказаў ён.

У шуфлядцы Малога ён знайшоў чорную крэйду, якой намаляваў на прасціне вусцішны твар. Потым ён узяў нажніцы Малога і выразаў дзве адтуліны для вачэй — Малы нават спыніць яго не паспеў.

— Прасціна... гэта з'ява банальная, — сказаў Карлсан. — А прывіду трэба бачыць, інакш яго можа занесці ў Індакітай ці яшчэ куды.

Ён накінуў прасціну на голаў, як балахон, і толькі ягоныя пульхныя ручкі тырчалі з бакоў. Хаця дзеці ведалі, што пад прасцінай усяго толькі Карлсан, ім усё адно зрабілася страшна, а Ёфа зайшоўся дзікім брэхам. Не супакоіла іх і тое, што прывід раптам завёў матор і пачаў лятаць вакол люстры, і прасціна пры гэтым трапятала ад хуткасці.

— Я маленькі матарызаваны прывід. Дзікі, але прыгожы, — сказаў Карлсан.

Дзеці стаялі нерухома і спалохана перыліся ў яго, а Ёфа брахаў.

— Праўду кажучы, я люблю лятаць шумна, — сказаў Карлсан. — Але калі ўжо прывіднічаць, дык, пэўна, лепей уключыць глушыльнік. Вось так!

І ён залунаў амаль бязгучна, зрабіўшыся яшчэ больш падобным да прывіда, чым раней.

Цяпер трэба было знайсці каго напалохаць.

— Я магу вылецець у пад'езд — там заўжды кагосьці сустрэнеш. У яго будзе шок на ўсё жыццё! — сказаў Карлсан.

Зазваніў тэлефон, але Малому не хацелася ісці адказваць. Ён пакінуў яго званіць.

Карлсан пачаў спрабаваць розныя страшныя ўздыхі і стогны.

— Прывід, які не ўмее ўздыхаць і стагнаць, нічога не варты, — сцвярджаў Карлсан, — Гэта першае,

што маленькія прывіды мусяць вывучыць у сваіх прывідных школах.

Усё гэта заняло багата часу. А калі яны нарэшце стаялі ў калідоры, гатовыя выйсці на лесвічную пляцоўку папрывіднічаць, то пачулі дзіўнае шкрабанне аб дзверы. Спачатку Малы падумаў, што мама і тата ўжо вярнуліся. Але потым ён заўважыў доўгі дрот, які прасунуўся ў шчыліну для лістоў. І тады Малы ўспомніў, як зусім нядаўна тата зачытваў нешта маме з газеты. Там было напісана, што акурат цяпер у горадзе з'явілася шмат дамушнікаў. Зладзеі былі хітрыя: спачатку яны тэлефанавалі, каб праверыць, ці ёсць хто дома. Калі ніхто не адказваў, яны хуценька беглі да той кватэры, куды званілі, і ім заставалася толькі ўзламаць замок, увайсці і злямзіць усё каштоўнае.

Малы страшэнна перапалохаўся, калі зразумеў, што ў дзверы лезуць зладзеі. Крыстэр і Гуніла таксама спужаліся. Крыстэр цяпер шкадаваў, што замкнуў Ёфу ў пакоі Малога, каб той не брахаў, пакуль прывід будзе страшыць народ.

Хто не баяўся, дык гэта Карлсан.

— Спакойна, толькі спакойна, — прашаптаў ён. — На такія вось выпадкі прывід — найлепшае, што можна прыдумаць. Давайце ўсе ў гасцёўню — гэта ж там, пэўна, твой бацька трымае свае залатыя зліткі і дыяменты? — сказаў ён Малому.

Карлсан, Малы, Гуніла і Крыстэр ціхенечка пракраліся ў гасцёўню і пахаваліся хто дзе. Карлсан ускочыў у прыгожую старую шафу, дзе мама захоўвала бялізну, але не паспеў толкам зачыніць дзверцы, бо зладзеі ўжо зайшлі на дыбачках у пакой. Малы, які ляжаў за канапай каля каміна, асцярожна выглянуў з-за яе. Пасярод вітальні стаялі двое злыдняў — вусцішнае відовішча. І — ты глядзі! — гэта былі не хтосьці там, а Філе і Руле.

— Тэк, цяпер давай знойдзем, дзе ў іх тут грошыкі-брыльянцікі, — сказаў Філе ціхім хрыплым голасам.

— У гэтай штуковіне, нябось, — сказаў Руле, паказваючы на антыкварны сакрэтнік, у якім было мноства маленькіх шуфлядак.

Малы ведаў, што ў адной з іх мама трымала грошы на гаспадарку, а ў другой — дарагі прыгожы пярсцёнак і брошку, што атрымала ад бабулі. А тата захоўваў там залаты медаль за трапнасць у стральбе. Будзе жахліва, калі зладзеі гэта ўсё ўмыкнуць, падумаў Малы і ледзьве не заплакаў у сябе за канапай.

— Ты давай разбярыся з гэтай махінай, — сказаў Філе. — А я тым часам схаджу на кухню, гляну, ці няма ў іх срэбных лыжак.

Філе знік, а Руле пачаў выцягваць шуфлядкі. Ён прысвіснуў ад задавальнення. «Знайшоў грошы

на гаспадарку», — падумаў Малы і засмуціўся яшчэ больш.

Руле выцягнуў наступную шуфлядку і зноў прысвіснуў: цяпер, відаць, ён знайшоў пярсцёнак і брошку.

Але потым Руле больш не свістаў. Таму што з шафы з папераджальным стогнам вылецеў прывід. І калі Руле азірнуўся і ўбачыў яго, з ягонага горла вырваўся хрып, а з рук выпалі грошы на гаспадарку, пярсцёнак, брошка і ўсё астатняе. Прывід лунаў вакол яго з уздыхамі і стогнамі, а потым раптам рынуўся на кухню. Праз секунду адтуль выбег зусім белы з твару Філе і закрычаў:

— Пруле, там рывід!

Ён хацеў сказаць «Руле, там прывід», але так спалохаўся, што замест гэтага сказаў «Пруле, там рывід!» І нядзіва, што ён спужаўся, бо прывід ляцеў за ім па пятах і вусцішна ўздыхаў ды стагнаў.

Руле і Філе кінуліся да дзвярэй, а прывід ляцеў за імі і лапатаў скрыдламі. Яны выбеглі ў калідор і за дзверы, але прывід вылецеў следам, пагнаў іх уніз па сходах і ўвесь час крычаў страшным ледзяным голасам:

— Спакойна, толькі спакойна! Зараз я вас даганю, вось тады мы павесялімся!

Але потым прывід стаміўся і вярнуўся ў гасцёўню. Малы падабраў з падлогі грошы, пярсцёнак і брошку і схаваў іх назад у сакрэтнік, а Гуніла з Крыстэрам пазбіралі ўсе срэбныя лыжкі, што выпалі з рук у Філе па дарозе з кухні ў гасцёўню.

— Найлепшы ў свеце прывід — гэта Карлсан, які жыве на даху! — сказаў Карлсан, здымаючы з сябе касцюм прывіда.

Дзеці засмяяліся: яны былі такія шчаслівыя! Карлсан сказаў:

— Нішто не перашкодзіць прывіду, калі трэба напалохаць зладзеяў! Калі б людзі ведалі пра гэта, то ля кожнай гарадской касы навязалі б па маленькім злосным прывідзе.

Малы ажно падскокваў ад радасці, што маміны грошы, пярсцёнак і брошка, а таксама срэбныя лыжкі і татаў залаты медаль уратаваныя.

— Падумаць толькі, якія ж дурныя бываюць людзі — вераць у прывідаў! — сказаў Малы. — Нічога звышнатуральнага не бывае, так сказаў тата.

Ён упэўнена кіўнуў.

— Дурныя зладзеі, яны думалі, што гэта прывід вылецеў з шафы, а гэта было не нешта звышнатуральнае, а ўсяго толькі Карлсан, які жыве на даху!

Карлсан чаруе з хітрунскім сабакам Альбергам

Наступнага ранку сонная ўскудлачаная фігурка ў блакітнай паласатай піжаме басанож прадыбала на кухню да мамы. Бусэ і Бэтан пайшлі ў школу, а тата ў кантору. Але Малому яшчэ рана было сыходзіць, і гэта было добра, бо ён вельмі любіў пабыць вось так сам-насам з мамай уранку. Хаця ён і быў вялікім хлопцам і хадзіў ужо ў школу, ён усё адно любіў пасядзець у мамы на каленках, калі ніхто не бачыў. Тады ў іх так добра атрымлівалася размаўляць, і калі хапала часу, мама і Малы звычайна спявалі адно аднаму песні ці баялі казкі.

Мама сядзела за сталом, чытала газету і піла ранішнюю каву. Малы ціха забраўся да яе на каленкі

і скруціўся там, і мама моўчкі абдымала яго, пакуль ён як след не прачнуўся.

Тая ўчорашняя вечаровая прагулка атрымалася крыху даўжэйшай, чым мама з татам планавалі, і калі яны вярнуліся, Малы ўжо спаў у ложку. Ён скінуў з сябе ўва сне коўдру, і калі мама папраўляла яе, то заўважыла на прасціне дзве непрыгожыя дзіркі і ўбачыла, што яна да таго ж вельмі брудная: нехта размаляваў яе чорнай крэйдай. Нядзіва, што Малы так хуценька заснуў, падумала мама. Але цяпер вінаваты сядзеў у яе на каленках, і яна зусім не збіралася адпускаць яго без тлумачэнняў.

— Паслухай, Малы, — сказала яна. — Я б дужа хацела ведаць, хто зрабіў тыя дзіркі ў тваёй прасціне. Толькі давай не кажы мне зараз пра Карлсана, які жыве на даху!

Малы маўчаў і напружана думаў. Карлсан жа акурат і *быў* тым, хто прарэзаў дзіркі, але казаць пра гэта нельга! Лепей за ўсё, пэўна, было маўчаць і наконт зладзеяў, бо ў гэта мама, хутчэй за ўсё, таксама не паверыць.

— Ну? — сказала мама, не атрымаўшы ніякага адказу.

— А ты не можаш спытаць Гунілу замест мяне? — выкруціўся Малы.

Гуніла магла б расказаць маме, як усё напраўду было, — ёй бы мама дакладна паверыла.

«Ага, дык гэта Гуніла прадзіравіла прасціну!» — падумала мама. І яшчэ яна падумала, што Малы — добры хлопчык, не наскардзіўся, а хоча, каб Гуніла сама расказала пра свой учынак. Мама лёгенька абняла Малога. Яна вырашыла пакуль больш не распытваць яго пра прасціну, але з Гунілай разабрацца адразу ж, як сустрэне яе.

— Табе Гуніла страшэнна падабаецца, праўда? — спыталася мама.

— Так, страшэнна... — сказаў Малы.

Мама пачала зноў зазіраць пакрысе ў газету, а Малы ціха сядзеў у яе на каленках і думаў. Хто яму, уласна кажучы, падабаўся? Перш за ўсё — мама... Ну і тата. Бусэ і Бэтан яму таксама часам падабаліся... Так, збольшага яны былі нічога... асабліва Бусэ... Але часам брала такая злосць на іх, што яго ледзьве не разрывала на кавалкі! Карлсан, які жыве на даху, таксама яму падабаўся. І Гуніла яму падабалася... шалёна. Можа, ён з ёй ажэніцца, калі вырасце, бо хочаш ці не хочаш, а жаніцца, пэўна, давядзецца. Хаця больш ён, вядома, хацеў бы ажаніцца з мамай... Але так, мабыць, не атрымаецца.

І тут яму ў галаву раптам прыйшла трывожная думка.

— Паслухай, мама, а калі Бусэ вырасце і памрэ, мне давядзецца ажаніцца з ягонай жонкай?

Мама здзіўлена адставіла кубак.

— Чаму гэта ты так вырашыў? — спытала яна.

Здавалася, што яна вось-вось засмяецца, і Малы спужаўся, што сказаў нешта недарэчнае, таму больш не хацеў пра гэта гаварыць. Але мама настойвала:

— Чаму ты так вырашыў?

— Бо мне перайшоў ад Бусэ яго стары ровар, — несхаць вымавіў Малы. — І яго старыя лыжы... І канькі, якія ў яго былі, калі яму было гадоў як і мне... І яго піжама, і кеды, і ўсё астатняе.

— Але з яго старой жонкай табе жаніцца не давядзецца, гэта я табе абяцаю, — сказала мама. На шчасце, яна не засмяялася.

— А нельга мне тады ажаніцца з табой? — прапанаваў Малы.

— Я нават не ведаю, як гэта магчыма, — сказала мама. — Я ж ужо замужам за татам.

І праўда што...

— Якое ж фенаменальнае няшчасце, што тата і я пакахалі адну! — з прыкрасцю сказаў Малы.

Але тады мама засмяялася і сказала:

— А па-мойму, гэта вельмі здорава!

— Табе можа і здорава, — сказаў Малы. — Ну а мне, відаць, давядзецца браць у жонкі Гунілу.

З кімсьці ж трэба будзе жаніцца ўсё адно, — дадаў ён.

Ён падумаў яшчэ над усім гэтым і вырашыў, што жыць з Гунілай будзе зусім не весела. З ёй часам так складана. І, дарэчы, ён хацеў жыць з мамай, татам, Бусэ і Бэтан. Не сказаць, каб яму так ужо карцела мець жонку.

— Я б нашмат больш хацеў мець сабаку, чым жонку, — сказаў ён. — Мама, можна мне завесці сабаку?

Мама ўздыхнула. Зноў-здароў, каторы раз Малы пачынае сваю вечную гутарку пра сабаку! Гэта было не менш надакучліва, чым з Карлсанам, які жыве на даху.

— Паслухай, Малы, па-мойму, табе час апранацца, — сказала мама. — Так ты спознішся ў школу.

— Як заўсёды, — пакрыўджана сказаў Малы. — Толькі я пачну пра свайго сабаку, як ты пачынаеш пра школу!

І ўсё ж ісці ў школу сёння было вельмі весела: столькі ўсяго ім трэба было абмеркаваць з Крыстэрам і Гунілай. Дамоў, як звычайна, яны ішлі разам, і Малы падумаў, што даўно гэта не было так прыемна: цяпер жа Гуніла і Крыстэр таксама пазнаёміліся з Карлсанам.

— Па-мойму, ён класны, — сказала Гуніла. — Як думаеш, сёння ён таксама прыляціць?

— Не ведаю, — сказаў Малы. — Ён кажа толькі, што прыляціць *прыблізна*, а гэта можа быць хоць калі.

— Спадзяюся, ён прыляціць прыблізна сёння, — сказаў Крыстэр. — Мы з Гунілай заскочым да цябе, можна?

— Я толькі рады, — сказаў Малы.

Але быў яшчэ нехта, хто хацеў ім скласці кампанію. Акурат калі дзеці збіраліся пераходзіць дарогу, да Малога падбегла чорненькае шчаня пудзеля. Яно абнюхала складкі на яго каленках і па-сяброўску цяўкнула.

— Глядзіце, які міленькі барбосік! — узрадаваўся да глыбіні душы Малы. — Бачыце, ён баіцца машын і хоча, каб я перавёў яго праз вуліцу!

Малому было б за шчасце перавесці яго праз незлічоную колькасць вуліц. Мабыць, шчаня адчула гэта, таму што пайшло з ім праз скрыжаванне, цесна тулячыся да яго нагі.

— Які ён цудоўны! — сказала Гуніла. — Хадзі сюды, мой барбоську!

— Не, ён хоча быць са мной, — сказаў Малы і моцна абхапіў шчанюка. — Я яму падабаюся.

— Я яму таксама падабаюся, бачыш? — сказала Гуніла.

Шчанючок выглядаў так, нібы яму падабаліся ўсе на свеце — абы толькі ён падабаўся ім. І Малому ён падабаўся — о, як жа падабаўся! Малы нахіліўся,

пагладзіў шчанюка, павабіў яго і выдаў з сябе процьму розных пяшчотных гукаў, якія ўсе разам значылі, што гэты шчанюк быў самым-найсамым-найчароўнейшым сабакам, які толькі ёсць. Шчаня памятляла хвосцікам з такім выглядам, нібы было з гэтым цалкам згоднае. Яно зацяўкала і весела заскакала побач, калі дзеці павярнулі на сваю вуліцу.

Малога ахапіла вар'яцкая надзея.

— Яму, напэўна, няма дзе жыць, — сказаў ён. — Пра яго, мабыць, няма каму паклапаціцца!

— Ды ёсць каму, — сказаў Крыстэр.

— Маўчы давай! — сярдзіта сказаў Малы. — Скуль табе ведаць!

Крыстэр, у якога быў Ёфа, — хіба можа ён зразумець, як гэта — не мець сабакі, зусім аніякага свайго сабакі!

— Хадзі, барбосік, — паклікаў Малы, у якога ўсё мацнела пэўнасць, што шчанюку няма дзе прытуліцца.

— Асцярожна, глядзі, каб ён не пайшоў за табой у дом, — сказаў Крыстэр.

— Чаму б яму і не пайсці? — сказаў Малы. — Я якраз і хачу, каб ён пайшоў з намі.

І шчанюк пайшоў разам з імі. Давёў іх да самага пад'езда, дзе жыў Малы. Потым Малы ўзяў яго на рукі і панёс па сходах.

— Я спытаюся ў мамы, ці можна мне яго пакінуць, — горача сказаў Малы.

Але мамы дома не было. На стале на кухні ляжала запіска, што яна ўнізе ў пральным пакоі

і што Малы можа знайсці яе там, калі яму нешта спатрэбіцца.

Але шчанюк уварваўся ў пакой Малога, нібы ракета, і Малы, Крыстэр і Гуніла рынуліся следам. Малы зусім ашалеў ад шчасця.

— Бачыце, ён хоча жыць са мной! — усклікнуў ён.

У той жа момант у акно пратарахцеў Карлсан.

— Здароўценькі! — крыкнуў ён. — Вы што, памылі сабаку? Нешта ён пакамечыўся і ссеўся.

— Гэта ж не Ёфа, хіба не бачыш! — сказаў Малы. — Гэта мой сабака.

— Ніякі ён не твой, — сказаў Крыстэр.

— Няма ў цябе ніякага сабакі, — сказала Гуніла.

— Вось у мяне — у мяне наверсе тысяча сабак, — сказаў Карлсан. — Найлепшы ў свеце сабакагадовец...

— Я не бачыў ніякіх сабак, калі быў у цябе, — сказаў Малы.

— Іх не было дома, яны ляталі, — запэўніў Карлсан. — Мае сабакі ўсе лятучыя.

Малы не слухаў Карлсана. Тысяча лятучых сабак былі нічым у параўнанні з гэтым міленькім шчанючком.

— Не думаю, што пра яго ёсць каму паклапаціцца, — сказаў ён ізноў.

Гуніла схілілася над сабачкам.

— Але на аброжку вось напісана — Альберг, — сказала яна.

— Цяпер ты бачыш: гэта акурат тыя, хто пра яго клапоціцца! — сказаў Крыстэр.

— Можа, гэты Альберг памёр, — сказаў Малы.

Кім бы той Альберг ні быў, Малому ён не падабаўся. Але тут яму прыйшла добрая думка.

— А можа, гэта *барбосіка* завуць Альбергам! — сказаў ён і ўмольна паглядзеў на Крыстэра і Гунілу.

Тыя задзірліва засмяяліся.

— У мяне ёсць некалькі сабак, якіх завуць Альбергамі, — сказаў Карлсан. — Здароўценькі, Альберг!

Шчаня скокнула ў бок Карлсана і залівіста забрахала.

— Бачыце! — закрычаў Малы. — Ён і сам ведае, што яго завуць Альбергам! Хадзі, маленькі мой Альберг!

Гуніла схапіла шчанюка.

— Тут яшчэ нумар тэлефона напісаны, — бязлітасна сказала яна.

— У гэтага сабакі ёсць тэлефон, — сказаў Карлсан. — Скажы яму, каб пазваніў сваёй служанцы і расказаў, што ён уцёк. Мае сабакі заўсёды так робяць, калі ўцякаюць.

Ён пагладзіў шчанюка таўсманенькай ручкай.

— Адзін з тых маіх сабак, якіх завуць Альберг, узяў і ўцёк некуды гэтымі днямі, — сказаў Карлсан. — І тады ён пазваніў дадому, каб пра гэта расказаць. Але ў яго крыху паблыталіся лічбы, і ён трапіў да старой маёрыхі, што жыве на Кунгсхольмене, і калі тая пачула, што на тым канцы дроту сабака, то сказала: «Гэта няправільны нумар». А Альберг адказаў: «Тады навошта вы адказваеце?» — бо ён такі разумны сабака!

Малы не слухаў Карлсана. Акурат цяпер яго не цікавіла нічога, апрача шчанючка, і ён нават і вухам не павёў, калі Карлсан сказаў, што схільны пахітраваць. Але тады Карлсан закапыліў губу і сказаў:

— Я з табой не гуляю, калі ты адно толькі кешкаешся ўвесь час з гэтым сабакам. Мне ж таксама хочацца павесяліцца!

Крыстэр і Гуніла ў гэтым яго падтрымалі.

— Мы маглі б зладзіць выступ з чарадзействамі, — сказаў Карлсан, калі скончыў дзьмуцца. — Найлепшы ў свеце чарадзей — здагадайцеся, хто гэта!

Малы, Гуніла і Крыстэр адразу ж здагадаліся, што гэта мусіць быць Карлсан.

— Значыць, вырашаем, што ладзім паказ чарадзействаў? — спытаў Карлсан.

— Так! — сказалі дзеці.

— І вырашаем, што ўваход каштуе адну ірыску, — сказаў Карлсан.

— Так! — сказалі дзеці.

— І вырашаем, што ўсе ірыскі пойдуць на дабрачынныя мэты... — сказаў Карлсан.

— Ну-у... — крыху задумліва сказалі дзеці.

— А сапраўды дабрачынная мэта ёсць толькі *адна* — гэта Карлсан, які жыве на даху, — сказаў Карлсан.

Дзеці пераглянуліся.

— Я нават не ведаю... — пачаў быў Крыстэр.

— Мы *вырашаем* так! — крыкнуў Карлсан. — А іначай я з вамі не гуляю.

Так і было вырашана, што ўсе ірыскі пойдуць Карлсану, які жыве на даху.

Крыстэр і Гуніла выйшлі ў двор і расказалі ўсім дзецям, якія там былі, што ў Малога адбудзецца паказ чарадзействаў. І ўсе, у каго засталося хаця б пяць эрэ з грошай, што даваліся на тыдзень, кінуліся да крамкі з садавіной купляць уваходныя ірыскі.

Потым гэтыя ірыскі яны аддавалі Гуніле, якая стаяла каля дзвярэй у пакой Малога і складала іх у скрынку з надпісам «На дабрачынныя мэты!»

Крыстэр расставіў крэслы ў шэраг пасярод пакоя — там мусіла сядзець публіка. У адным куце

пакоя вісела коўдра, за якой чулася шушуканне і сабачае цяўканне.

— Што вы нам збіраецеся паказаць? — спытаў хлопчык, якога звалі Кірэ. — Якое-небудзь абы-што, няйначай, але калі так, то я забяру сваю ірыску назад.

Ні Малы, ні Гуніла, ні Крыстэр не любілі гэтага Кірэ, бо ён заўсёды быў такім вось задзірам.

Малы, які хаваўся за коўдрай, выйшаў наперад. Ён трымаў на руках шчанючка.

— Вы ўбачыце найлепшага ў свеце чарадзея і хітрунскага сабаку Альберга! — сказаў ён.

— Як ужо сказалі, найлепшы ў свеце чарадзей! — пачуўся голас з-за коўдры, і адтуль выйшаў Карлсан.

На галаве ў яго быў цыліндр таты Малога, а на плячах вісеў клятчасты фартух мамы, завязаны пад падбароддзем прыгожым бантам. Фартух мусіў быць замест такой чорнай мантыі, якую звычайна носяць усялякія чарадзеі.

Усе запляскалі ў ладкі — усе, акрамя Кірэ. Карлсан пакланіўся, выгляд у яго быў вельмі самазадаволены. Потым ён зняў з галавы цыліндр і паказаў, што той пусты, — зусім як робяць усялякія чарадзеі.

— Калі ласка, глядзіце, шаноўнае спадарства! — сказаў ён. — Тут няма нічога, зусім анічога!

«Зараз ён начаруе, каб з цыліндра выскачыў трусік, — падумаў Малы, бо аднойчы бачыў, як чарадзей гэта робіць. — Здорава будзе паглядзець!»

— Як я сказаў, тут няма нічога, — скрушна сказаў Карлсан. — І тут нічога і не з'явіцца, калі вы не пакладзяце туды крыху таго-сяго, — працягнуў

ён. — Бачу, тут сядзіць куча маленькіх праглотаў, што ўвесь час жуюць ірыскі. Зараз мы пусцім цыліндр па коле, і кожны пакладзе туды ірыску. Гэта пойдзе на вельмі дабрачынныя мэты.

Малы пранёс капялюш, і хутка ў ім ужо была добранькая кучка ірысак. Ён перадаў цыліндр Карлсану.

— Пагрымвае сумнеўна, — патрос яго Карлсан. — Калі б ён быў поўны ірысак, то зусім бы не грымеў.

Ён засунуў у рот ірыску і задаволена пачаў яе жаваць.

Кірэ не паклаў аніводнай ірыскі ў капялюш, хаця ў яго быў цэлы кулёк.

— Што ж, дарагія мае сябры... і Кірэ, — сказаў Карлсан. — Перад вамі — хітрунскі сабака Альберг. Ён умее рабіць усё. Званіць па тэлефоне, лятаць, пячы булачкі, размаўляць, падымаць лапу — усё!

Тут пудзельчык і праўда падняў лапку перад крэслам Кірэ і зрабіў маленечкую лужынку на падлозе.

— Вы бачыце, што я не перабольшваю, — сказаў Карлсан. — Гэты сабака напраўду ўмее ўсё.

— Пфф, — сказаў Кірэ і адсунуў сваё крэсла ад лужынкі, — так любая кудла ўмее. Але няхай ён у вас пагаворыць — гэта, нябось, трохі складаней, ха-ха!

Карлсан павярнуўся да шчанюка.

— Як лічыш, Альберг, ці складана размаўляць?

— Зусім не складана, — сказаў Альберг. — Хіба толькі калі куру цыгару.

Малы, Гуніла і Крыстэр ледзь не падскочылі, бо гучала гэта так, нібы гаварыў і праўда шчанюк. Але Малы падумаў, што гэта, відаць, нейкі хітрык Карл-

сана. І гэта было добра, бо Малы хацеў звычайнага сабаку, а не такога, які ўмее размаўляць.

— Мілы Альберг, — сказаў Карлсан, — ці не мог бы ты крыху расказаць пра сваё сабачае жыццё ўсім нашым сябрам... і Кірэ?

— З радасцю, — адказаў Альберг.

І ён пачаў расказваць.

— Неяк нядаўна ўвечары я хадзіў у кіно, — сказаў ён і гулліва заскакаў вакол Карлсана.

— Праўда, ты быў у кіно? — удакладніў Карлсан.

— Ага, і каля мяне на адной лаўцы сядзелі дзве блыхі, — сказаў Альберг.

— Што ты кажаш! — здзівіўся Карлсан.

— Ага, і калі мы пасля выйшлі з кіно, то я пачуў, як адна блыха кажа другой: «Пойдзем дадому пешкі ці пад'едзем на сабаку?»

Усім дзецям падабаўся выступ, нават калі чарадзействаў у ім было не так шмат. Толькі Кірэ сядзеў з пагардлівым выразам твару.

— Скажы яму, каб напёк нам булачак, — насмешліва сказаў ён.

— Не хочаш спячы пару булачак, Альберг? — спытаў Карлсан.

Альберг пазяхнуў і лёг на падлогу.

— Не, не магу, — сказаў ён.

— Ха-ха, я так і думаў! — сказаў Кірэ.

— Не магу, бо ў мяне дома зусім не засталося дражджэй, — сказаў Альберг.

Дзецям вельмі падабаўся Альберг. Але Кірэ працягваў.

— Ну хай тады ён палятае, — сказаў ён. — Для гэтага дрожджы не трэба.

— Хочаш палятаць, Альберг? — спытаў Карлсан.

Здавалася, што Альберг ужо заснуў, але ён усё адно адказаў, калі Карлсан да яго звярнуўся.

— Ну вядома, чаму б не палятаць, гэта я магу! — сказаў ён. — Але ты тады таксама палятай са мной, бо я абяцаў маме, што ніколі сам у паветра падымацца не буду.

— Калі так, хадзі сюды, мой маленькі Альберг, — сказаў Карлсан і ўзяў шчанюка на рукі.

Праз секунду яны разам ужо ляталі. Спачатку ўзняліся да столі і двойчы абляцелі люстру, а пасля шуганулі проста ў акно. Тут нават Кірэ збляднеў ад нечаканасці.

Дзеці кінуліся да акна — пастаўшы там, яны ўбачылі, як Карлсан і Альберг лунаюць па-над дахамі дамоў. Малы закрычаў з адчаем:

— Карлсан, Карлсан, ляці назад з маім сабакам!

І Карлсан прыляцеў назад. Ён хутка вярнуўся і апусціў Альберга на падлогу. Той абтросся, і выгляд у яго быў такі здзіўлены, што можна было па-

думаць, быццам гэта быў першы ў ягоным жыцці палёт.

— Што ж, на сёння ўсё, больш мы нічога прапанаваць вам не можам, — сказаў Карлсан. — Затое можаш *ты*, — сказаў ён і даў Кірэ лёгкага штурхаля.

Кірэ не зразумеў, чаго ён хоча.

— Ірыска, — сказаў Карлсан.

І Кірэ ўзяў свой кулёк і ўвесь аддаў яго Карлсану, хаця спачатку дастаў адтуль ірыску для сябе.

— Што за ненажэрны хлопчык, — сказаў Карлсан. Потым узрушана агледзеўся па баках. — Дзе скрынка для дабрачынных мэт? — спытаў ён.

Гуніла прынесла. Яна падумала, што зараз Карлсан нарэшце ўсіх пачастуе, раз у яго цяпер так шмат ірысак. Але не. Карлсан узяў скрынку і прагна пералічыў усе ірыскі.

— Пятнаццаць, — сказаў ён. — На вячэру хопіць! Бываце здароўценькі! Я дадому, час вячэраць!

І Карлсан знік за акном.

Дзецям трэба было разыходзіцца па дамах, Гуніле з Крыстэрам таксама.

Малы і Альберг засталіся адны, і Малому гэта вельмі падабалася. Ён узяў шчанюка на рукі і сядзеў, нашэптваючы яму нешта на вуха. Шчаня лізнула яго ў твар і заснула. Яно смешна пасопвала ў сне.

Але потым з пральні вярнулася мама, і ўсё зрабілася страшэнна сумным. Мама ні разу не паверыла, што Альбергу няма дзе жыць. Яна пазваніла па нумары на аброжку і расказала, што яе хлопчык падабраў чорнага пудзялька.

Малы стаяў каля тэлефона, абдымаючы Альберга, і ўвесь час шаптаў яму:

— Добры, мілы Божа, зрабі так, каб гэта не быў іхні шчанюк!

Але ён *быў* іхні.

— Сынок, — сказала мама, паклаўшы слухаўку. — Гаспадар Бобі — хлопчык, якога завуць Стафан Альберг.

— Бобі? — перапытаў Малы.

— Так завуць шчанюка. Стафан плакаў цэлы дзень. А сёмай ён прыйдзе забраць Бобі.

Малы нічога не сказаў, але твар яго крыху пабялеў, а вочы зрабіліся бліскучыя-бліскучыя. Ён абняў шчанюка і прашаптаў яму ў вуха, калі мама не чула:

— Мілы Альберг, я хачу, каб ты быў маім сабакам.

Але а сёмай прыйшоў Стафан Альберг і забраў свайго шчанюка. Малы ляжаў у ложку і рыдаў, і яму здавалася, што ў яго вось-вось разарвецца сэрца.

Карлсан ідзе на дзень народзінаў

Прыйшло лета, школа скончылася, і Малому трэба было ехаць да бабулі. Але спачатку муселіла адбыцца нешта вельмі важнае. Малому спаўнялася восем. О, як доўга ён чакаў гэты дзень! Амаль з таго дня, як яму споўнілася сем. Дзіўна, як доўга цягнеца час паміж днямі народзінаў, — амаль гэтак жа доўга, як паміж Калядамі.

У вечар перад народзінамі ў яго была невялікая гутарка з Карлсанам.

— У мяне будзе свята, — сказаў Малы. — Гуніла і Крыстэр прыйдуць, і ў маім пакоі мне накрыюць імянінны стол...

Малы змоўк і спахмурнеў.

— Я так хацеў бы запрасіць і цябе, — сказаў ён, — але...

Мама вельмі злавалася на Карлсана, які жыве на даху. Не варта было нават спрабаваць

яе прасіць, каб яна дазволіла паклікаць яго на свята.

Але Карлсан закапыліў губу больш чым калі.

— Я з табой не гуляю, калі мне нельга прыйсці на свята, — сказаў ён. — *Мне* ж таксама трэба павесяліцца!

— Вядома, вядома, табе *можна* прыйсці на свята! — паспешліва сказаў Малы. Ён пагаворыць з мамай — і хай будзе як будзе! Ён не мог святкаваць дзень народзінаў без Карлсана.

— Які будзе пачастунак? — спытаў Карлсан, калі скончыў дзьмуцца.

— Торт, вядома ж! — сказаў Малы. — У мяне будзе торт з васьмю свечкамі.

— Вунь як, — сказаў Карлсан. — Слухай, а ў мяне прапанова!

— Якая? — спытаў Малы.

— Ты не можаш папрасіць маму, каб табе далі свечку з васьмю тартамі?

Малы не думаў, што мама на такое пагодзіцца.

— Ну а якія-небудзь добрыя падарункі ты атрымаеш? — спытаў Карлсан.

— Не ведаю, — сказаў Малы.

Ён уздыхнуў. Ён ведаў дакладна, што хацеў бы атрымаць, — больш за ўсё іншае на зямлі. Але гэтага яму не падораць.

— Сабакі ў мяне, пэўна, не прадбачыцца да самай смерці, — сказаў ён. — Але, вядома, у мяне будзе куча іншых падарункаў. Так што мне ўсё адно будзе весела, і я вырашыў, што цэлы дзень не буду нават думаць ні пра якога сабаку.

— І не трэба, у цябе ж ёсць я, — сказаў Карлсан. — І здаецца мне, што гудзець я ўмею куды гучней, чым сабака!

Ён схіліў галаву набок і паглядзеў на Малога.

— Вось мне цікава, якія табе дастануцца падарункі? — сказаў ён. — Цікава, а ці падораць табе ірыскі? Калі так, то я лічу, што іх трэба неадкладна пусціць на дабрачынныя мэты.

— Калі атрымаю які кулёк — ён твой, — сказаў Малы.

Ён быў гатовы зрабіць для Карлсана ўсё, асабліва цяпер, калі яны мусілі неўзабаве расстацца.

— Карлсан, паслязаўтра я паеду да бабулі і буду там усё лета, — сказаў Малы.

Спачатку Карлсан крыху спахмурнеў, але потым важна прамовіў:

— *Я* таксама паеду да *сваёй* бабулі. Яна нашмат бабульнейшая за тваю.

— А дзе яна жыве, твая бабуля? — спытаў Малы.

— У доме, — сказаў Карлсан. — Ці ты думаў, што яна гойсае на дварэ цэлымі начамі?

Потым яны ўжо не размаўлялі ні пра бабулю Карлсана, ні пра падарункі Малога, ні пра што іншае, бо час быў позні і Малому трэба было класціся спаць, каб ён змог прачнуцца як мага раней у свой дзень народзінаў.

Тыя хвіліны, калі ляжыш і чакаеш, што вось-вось адчыняцца дзверы і ўсе ўвойдуць у твой пакой са святочным пачастункам, з падарункамі і ўсім-усім, — самыя цяжкія. Малы адчуваў, як у жываце аж ныла ад прадчуванняў.

Але вось і яны. За дзвярыма пачулася, як яны выводзяць разам «З днём нараджэння, Малы!», потым дзверы адчыніліся, і ўсе ўвайшлі ў пакой: мама з татам і Бусэ з Бэтан.

Малы ўсхапіўся на ложку, вочы яго заззялі.

— З днём народзінаў, любы Малы, — сказала мама.

І ўсе сказалі яму:

— З днём народзінаў!

Яны прынеслі торт з васьмю свечкамі і паднос з падарункамі.

Там ляжала ажно некалькі падарункаў. Можа, праўда, не так шмат, як бывала *звычайна* на яго дні народзінаў. Як Малы ні пералічваў пакункі, іх не рабілася болей за чатыры. Але тата сказаў:

— Дзень доўгі, могуць яшчэ і іншыя падарункі прыспець. Неабавязкова ж усё атрымліваць адразу зранку.

Малы вельмі радаваўся сваім чатыром пакункам. Там былі фарбы, цацачны пісталет, кніга і новыя джынсы. Малому ўсё вельмі спадабалася. Якія ж яны

добрыя: і мама з татам, і Бусэ з Бэтан! Ні ў кога не было такіх добрых мамы і таты, брата і сястры, як у яго!

Ён стрэльнуў пару разоў з пісталета — той бабахаў як мае быць.

Сям'я прысела да яго на край ложка і слухала — о, якія ж яны ў яго цудоўныя!

— Гэта ж падумаць, што прайшло ўжо восем гадоў, як гэтае хлапчаня з'явілася на свет! — сказаў тата.

— Сапраўды! — сказала мама. — Як ляціць час! Памятаеш, які дождж ішоў у Стакгольме ў той дзень?

— Мама, а я ж нарадзіўся тут, у Стакгольме? — спытаў Малы.

— Тут, вядома, — сказала мама.

— А Бусэ з Бэтан — яны нарадзіліся ў Мальмэ?

— Так, яны там.

— А ты, тата? Ты казаў, што нарадзіўся ў Гётэборгу?

— Так, я гётэборгскі хлопец, — сказаў тата.

— А ты, мама, дзе нарадзілася?

— У Эскільстуне, — сказала мама.

Малы моцна абняў яе за шыю.

— Гэта проста фенаменальнае шчасце, што мы ўсе сустрэліся!

Усе з гэтым пагадзіліся. І яны праспявалі Малому яшчэ раз «З днём народзін, Малы!», а ён стрэліў са свайго пісталета, які так каласальна бабахаў.

Цягам дня ён настраляўся з пісталета па самыя вушы, пакуль чакаў, калі прыйдзе час святкавання. І шмат разважаў над словамі таты пра тое, што могуць прыспець і іншыя падарункі. На кароткі, шчаслівы міг яму ўсё ж прыйшла думка, што, можа, цуд усё-ткі здарыцца і яму падораць сабаку. Але ён разумеў, што гэта немагчыма. І нават насварыўся на сябе за тое, што яму лезуць такія дурныя думкі: ён жа вырашыў усё адно радавацца ўвесь дзень народзінаў і не думаць ні пра якога сабаку.

І Малы *сапраўды* радаваўся. Пасля абеду мама пачала святочна накрываць на стол у ягоным пакоі. Яна прынесла цэлую кучу кветак і паставіла тры найлепшыя кубачкі, ружовыя.

— Мама, кубачкаў трэба чатыры, — сказаў Малы.

— Навошта? — здзівілася мама.

Малы праглынуў камяк у горле. Ён быў вымушаны сказаць, што запрасіў Карлсана, хаця маме гэта дакладна не спадабаецца.

— Карлсан таксама прыляціць, — сказаў Малы і паглядзеў маме проста ў вочы.

— О-о-ох, — сказала мама. — О-о-ох! Ну але хай сабе, сёння ж твой дзень народзінаў.

Яна пагладзіла Малога па светлай макаўцы.

— Колькі ў цябе яшчэ дзіцячых выдумак, Малы. Нават не верыцца, што табе ўжо восем... Вось ну колькі табе напраўду?

— Я мужчына ў сваім найлепшым веку, — з годнасцю адказаў Малы. — І Карлсан таксама.

Дзень народзінаў працягваўся. Ён і праўда здаваўся доўгім, а новыя падарункі ўсё не прыспявалі.

Урэшце яшчэ адзін ён усё ж атрымаў. Бусэ і Бэтан, у якіх яшчэ не пачаліся канікулы, прыйшлі са школы і зачыніліся ў пакоі Бусэ. Малога туды не пусцілі. Ён чуў, як яны там хіхікаюць і шамацяць паперай. Малога проста распірала ад цікаўнасці.

Нарэшце яны выйшлі, і Бэтан са смехам падала яму пакунак. Малы вельмі ўзрадаваўся і хацеў адразу разарваць паперу. Але Бусэ сказаў:

— Ты спачатку вершык прачытай, які тут напісаны.

Яны напісалі яго вялікімі друкаванымі літарамі, каб Малы змог прачытаць сам, і ён пачаў:

Не было яшчэ ні дня,
Каб ты не папрасіў шчаня.
Ты шчасліўчык, бо на свята
Ад сястры табе і брата
Дастанецца суперзвер —
Так што радуйся цяпер!
Ціхі плюшавы шчанюк
Не ўцячэ ў цябе з-пад рук,
Не абсікае дыван —
Твой сабака без заган!

Малы стаяў зусім нерухома, зусім ціха.

— Ну давай, можаш распакоўваць цяпер, — сказаў Бусэ.

Але Малы кінуў пакунак на падлогу, і слёзы пырснулі ў яго з вачэй.

— Чаго ты, Малы, што з табой? — усклікнула Бэтан.

— Ты пакрыўдзіўся? — засмучана спытаўся Бусэ.

Бэтан абняла Малога.

— Прабач нас, мы проста пажартавалі, разумееш?

Малы раз'юшана выкруціўся з яе рук. Слёзы лілі-ся па ягоных шчоках.

— Вы ж ведалі, — усхліпваў ён, — вы ж ведалі, што я хачу *жывога* сабаку, навошта было дражніцца?

Ён кінуўся ад іх у свой пакой і ўпаў на ложак. Бусэ і Бэтан рушылі следам, за імі прыбегла мама. Але Малы не звяртаў на іх увагі. Яго ўсяго трэсла ад плачу. Увесь дзень народзінаў сапсаваны. Ён жа вырашыў, што будзе радавацца, нават калі яму не падораць ніякага сабакі, — але вось табе, яны ўзялі і падарылі яму *плюшавага* сабаку!.. Калі ён падумаў пра гэта, плач перайшоў у сапраўдныя рыданні, і Малы занурыўся тварам у падушку як мага глыбей. Мама з Бусэ і Бэтан стаялі вакол і таксама перажывалі.

— Я пазваню тату і папрашу яго раней вярнуцца з канторы, — сказала мама.

Малы плакаў... ну што з таго, што тата прыйдзе? Усё цяпер было сумна, свята сапсаванае, і нічога не магло гэтага змяніць.

Ён чуў, як мама пайшла званіць... Але ён плакаў. Крыху пазней ён пачуў, што тата прыйшоў дадому... Але ён плакаў. Ён больш ніколі не зможа радавацца. Было б лепей, калі б ён памёр, і хай тады Бусэ і Бэтан забяруць свайго плюшавага сабаку і ніколі-ніколі не змогуць забыць, як брыдка абышліся са сваім малодшым братам, пакуль ён быў жывы, у ягоны дзень народзінаў.

І раптам яны ўсе стаялі каля яго ложка: тата з мамай і Бусэ з Бэтан. Ён яшчэ глыбей занурыўся тварам у падушку.

— Малы, цябе нехта чакае ў калідоры, — сказаў тата.

Малы не адказаў. Тата пакатурхаў яго за плячо.

— Ці ты не чуеш, твой добры сябрук чакае цябе ў калідоры!

— Крыстэр там, ці што? — раздражнёна буркнуў Малы.

— Не, яго завуць Бімба, а не Крыстэр, — прамармытала мама.

— Не ведаю я ніякіх Бімбаў, — яшчэ больш раздражнёна буркнуў Малы.

— Можа і так, — сказала мама. — Але ён вельмі хоча з табой пазнаёміцца.

Тут з калідора пачуўся кароценькі сабачы цяўк.

Малы напружыўся і моцна ўхапіўся за падушку... не, хопіць яму ўяўляць усялякае рознае!

Але ціхае цяўканне пачулася зноў. Малы ўсхапіўся на ложку.

— Гэта сабака? — спытаў ён. — Гэта *жывы* сабака?

— Так, гэта *твой* сабака, — сказаў тата.

І тады Бусэ кінуўся ў калідор, а праз секунду вярнуўся, трымаючы ў руках — о, гэта не магло быць праўдай! — у руках у яго было маленькае шчаня шарсткашэрснай таксы!

— Гэта *мой* жывы сабака? — прашаптаў Малы.

У яго вачах усё яшчэ стаялі слёзы, калі ён пацягнуўся да свайго Бімба. Здавалася, ён баяўся, што ў любы міг той распусціцца ў паветры і знікне.

Але Бімба не знікаў. Бімба апынуўся ў яго абдымках, Бімба лізаў яго ў твар, ціхенька скавытаў, цяўкаў і лавіў ягонае вуха. Бімба быў проста каласальна жывы.

— Цяпер ты рады, Малы? — спытаў тата.

Малы ўздыхнуў. Як толькі тата мог пра гэта пытацца? Ён быў такі рады, што ажно шчымела недзе ці то ў душы, ці то ў жываце, ці дзе там шчыміць, калі ты такі шчаслівы.

— Той плюшавы сабака, Малы, — ён мусіў быць цацкай для Бімба, разумееш? — сказала Бэтан. — Мы не хацелі цябе дражніць... так моцна, — дадала яна.

Малы ўсё ім прабачыў. Дый, па шчырасці, ён не надта слухаў, што яна кажа. Бо ён гутарыў з Бімба.

— Бімба, Бімбачка, ты *мой* сабака.

Потым ён сказаў маме:

— Па-мойму, Бімба яшчэ больш мілы, чым Альберг. Бо шарсткашэрсныя таксы самыя-самыя мілыя.

Пасля ён успомніў, што ў любую хвіліну маглі прыйсці Гуніла і Крыстэр. Аёй, у яго ў галаве не ўкладвалася, што столькі прыемнасцяў *магло* адбывацца ў адзін дзень. Зараз яны пабачаць, што ў яго ёсць *сапраўды* ягоны сабака — самы прыгожы-прыгажэнны-прыгажусенькі ў свеце.

Але раптам ён захваляваўся.

— Мама, а мне можна будзе ўзяць Бімба, калі мы паедзем да бабулі?

— Вядома! Павязеш яго вось у гэтым кошычку, як паедзем на цягніку, — сказала мама і паказала

на сабачы кошык, які Бусэ таксама прынёс сюды з калідора.

— О-о-о! — сказаў Малы. — О-о-о!

Тут у дзверы пазванілі. Гэта прыйшлі Гуніла і Крыстэр. Малы кінуўся да іх і закрычаў:

— Мне падарылі сабаку! Гэта мой уласны сабака!

— Ой, ты глядзі, які ён прыгожы! — сказала Гуніла. Але потым спахапілася і сказала:

— З днём народзінаў! Гэта ад нас з Крыстэрам.

Яна падала яму кулёк ірысак. А потым кінулася да Бімба, зноў ускрыкваючы:

— Ой, які ж прыгожанькі!

Малому падабалася гэта чуць.

— Амаль такі ж прыгожы, як Ёфа, — сказаў Крыстэр.

— Амаль прыгажэйшы, — сказала Гуніла. — Нават прыгажэйшы за Альберга.

— Так, нашмат прыгажэйшы за Альберга, — сказаў Крыстэр.

Малы падумаў, што Гуніла і Крыстэр абодва вельмі прыемныя. Ён запрасіў іх за святочны стол.

Мама акурат расклала там шмат-шмат маленечкіх смачных бутэрбродаў з шынкай і сырам і процьму ўсялякага печыва. А пасярод стала стаяў імянінны торт з васьмю свечкамі.

Мама прынесла з кухні вялікі паднос з гарачым шакаладам. Яна адразу ж пачала разліваць яго ў кубачкі.

— Можа, пачакаем Карлсана? — асцярожна спытаў Малы.

Мама пахітала галавой.

— Малы, давай забудзем зараз пра Карлсана. Бо, ведаеш, я амаль пэўная, што ён не прыляціць. З гэтага часу мы пра яго проста забудзем раз і назаўжды. Цяпер жа ў цябе ёсць Бімба.

Так, цяпер у яго і праўда быў Бімба... Таму Малы асабліва хацеў, каб Карлсан усё ж прыляцеў да яго на свята.

Гуніла і Крыстэр селі за стол, і мама паклала ўсім бутэрбродаў. Малы занёс Бімба ў кошык-ляжанку і таксама сеў за стол. Мама пайшла і пакінула дзяцей адных.

Бусэ засунуўся ў пакой і крыкнуў:

— Ты ж пакінеш нам крыху торта, каб мы з Бэтан таксама пакаштавалі па кавалачку?

— Пакіну, не хвалюйся, — сказаў Малы. — Хаця, па шчырасці, гэта несправядліва, бо вы ўміналі торцікі без мяне сем-восем гадоў запар, пакуль я не нарадзіўся.

— І не думай! Я хачу вялікі кавалак, — сказаў Бусэ і зачыніў дзверы.

Толькі ён гэта зрабіў, як пачулася звыклае гудзенне і ў пакой заляцеў Карлсан.

— Вы ўжо ўсё пачалі? — крыкнуў ён. — Колькі вы з'елі?

Малы супакоіў яго і сказаў, што яны яшчэ нічога не паспелі з'есці.

— Цудоўна, — сказаў Карлсан.

— Ты не будзеш віншаваць Малога? — спытала Гуніла.

— А, так, з днём народзінаў, — сказаў Карлсан, — дзе мне сесці?

Але для Карлсана не хапала кубачка, і калі ён заўважыў гэта, дык адразу закапыліў губу і надзьмуўся.

— Я з вамі не гуляю, калі ўсё так несправядліва. Чаму *мне* не далі кубачка?

Малы хуценька аддаў яму свой. Потым асцярожна збегаў на кухню і ўзяў сабе яшчэ адзін.

— Карлсан, мне падарылі сабаку, — сказаў ён, вярнуўшыся ў пакой. — Ён ляжыць вунь там, яго завуць Бімба.

Малы паказаў на Бімба, які заснуў у сваім кошыку.

— Вунь як, здорава! — сказаў Карлсан. — Перадай *вунь той* бутэрброд... і *той*... і *той*!

— Успомніў! — сказаў ён пасля. — У мяне ёсць падарунак для цябе, я самы добры ў свеце.

Ён дастаў з кішэні штаноў свісцёлку і падаў Малому.

— Можаш свістаць у яе, каб паклікаць Бімба. Я звычайна таксама клікаў так *сваіх* сабак, хоць маіх сабак завуць Альбергамі і яны ўмеюць лятаць.

— Іх усіх-усіх завуць Альбергамі? — спытаў Крыстэр.

— Усю тысячу, — сказаў Карлсан. — Калі прыступім да торта?

— Дзякуй, даражэнькі Карлсан, за свісцёлку, — сказаў Малы. — О, як здорава будзе дзьмуць у яе, каб клікаць Бімба!

— Хаця я часам, мабыць, буду яе пазычаць, — сказаў Карлсан. — Я буду пазычаць яе, мабыць, даволі часта, — сказаў ён і ўсхвалявана працягнуў:

— Табе падарылі ірыскі?

— Падарылі! — сказаў Малы. — Гуніла з Крыстэрам.

— Яны неадкладна пойдуць на дабрачынныя мэты, — сказаў Карлсан і схапіў кулёк. Ён засунуў яго ў кішэню, а потым накінуўся на бутэрброды.

Гуніле, Крыстэру і Малому давялося вельмі паспяшацца, каб таксама паспець нешта ўхапіць. Але, на шчасце, мама нарабіла вельмі шмат бутэрбродаў.

А ў гасцёўні сядзелі мама, тата, Бусэ і Бэтан.

— Чуеце, як ім там весела? — сказала мама. — О, як я радуюся, што Малы атрымаў свайго сабаку! Будзе клопату, вядома, але што зробіш.

— Так, цяпер ён забудзецца на свае недарэчныя фантазіі пра Карлсана, які жыве на даху, я ў гэтым упэўнены, — сказаў тата.

З пакоя Малога даносіліся смех і гоман, і мама сказала:

— Ці не зазірнуць нам да іх? Яны такія мілыя, гэтыя дзеткі!

— Так, хадземце паглядзім на іх! — сказала Бэтан.

І вось яны ўсе: мама, тата, Бусэ і Бэтан — пайшлі зірнуць, як ідзе свята Малога.

Дзверы адчыніў тата. Але першай ускрыкнула мама. Бо гэта яна першая заўважыла таўсматага дзядзечку, які сядзеў побач з Малым.

Таўсматага дзядзечку з размазаным да самых вушэй вяршковым крэмам з торта.

— Я зараз упаду... — сказала мама.

Тата, Бусэ і Бэтан стаялі аслупянеўшы і глядзелі ва ўсе вочы.

— Карлсан усё ж прыляцеў, бачыш, мама? — весела сказаў Малы. — О, які ж цудоўны ў мяне дзень народзінаў!

Таўсматы дзядзечка змахнуў крыху крэму з вуснаў, а потым памахаў пульхнай ручкай тату, маме, Бусэ і Бэтан так, што вяршкі паляцелі ва ўсе бакі.

— Здароўценькі! — крыкнуў ён. — Вы ж раней не мелі гонару са мной пазнаёміцца? Мяне завуць

Карлсан, які жыве на даху... Аёй, аёй, Гуніла, хопіць сабе накладаць, мне ж таксама трэба пакаштаваць крыху торта!

Ён схапіў Гунілу за руку, якой яна трымала лапатку, і Гуніле давялося застацца без торта.

— Ніколі не бачыў такой ненажэрнай дзяўчынкі, — сказаў ён.

А потым узяў сабе вялізны кавалак.

— Найлепшы ў свеце паядальнік тартоў — гэта Карлсан, які жыве на даху, — сказаў ён і заззяў усмешкай.

— Хадземце адсюль, — прашаптала мама.

— Што ж, не буду вам замінаць, — сказаў Карлсан.

— Паабяцай мне адну рэч, — сказаў маме тата, калі яны зачынілі за сабой дзверы. — Паабяцайце мне ўсе адну рэч — і вы, Бусэ і Бэтан, таксама! *Нікому* пра гэта не расказвайце, зусім-зусім *анікому*!

— Чаму гэта? — спытаў Бусэ.

— Ніхто ў гэта не паверыць, — сказаў тата. — А *калі паверацъ*, то нас не пакінуць у спакоі ні на хвіліну да канца нашага жыцця.

Тата, мама, Бусэ і Бэтан паабяцалі адно аднаму, што не раскажуць ніводнаму чалавеку пра дзіўнага сябра па гульнях, якога завёў сабе Малы.

І яны стрымалі слова. Ніхто ніколі не пачуў ад іх ніводнага слова пра Карлсана. І таму Карлсан можа спакойна жыць далей у сваім дамочку, пра які ніхто не ведае, хоць ён месціцца на звычайным даху звычайнага дома на зусім звычайнай вуліцы Стакгольма. Карлсан можа спакойна гуляць дзе хоча ды хітраваць — і акурат гэтым ён і займаецца. Бо ён найлепшы ў свеце хітрун.

Калі ўсе бутэрброды скончыліся, і ўсё печыва, і торт таксама; калі Гуніла і Крыстэр сышлі дадому, а Бімба спаў — тады Малы развітаўся з Карлсанам. Карлсан сядзеў на падаконні, гатовы ляцець. Фіранкі ціха ўздымаліся і ападалі, у паветры стаяла цеплыня: было лета.

— Мілы, мілы Карлсан, ты ж дакладна будзеш жыць на даху, як і раней, калі я вярнуся ад бабулі? — спытаў Малы.

— Спакойна, толькі спакойна, — сказаў Карлсан. — Калі толькі бабуля адпусціць мяне, то буду. Але гэта недакладна. Бо яна лічыць, што я найлепшы ўнук у свеце.

— А гэта так? — спытаў Малы.

— Ну а хто, скажы ты мне, можа ім быць? Можа, *ты* назавеш кагосьці? — спытаў Карлсан.

І ён павярнуў круцёлку, што была прыблізна там, дзе пуп. Матор загудзеў.

— Калі я вярнуся, мы наядзімся торта як след! — крыкнуў ён. — Ад гэтага не таўсцеюць. Бывай здароўценькі, Малы!

— Бывай здароўценькі, Карлсан! — крыкнуў Малы.

І Карлсан знік.

Але ў кошыку каля ложка Малога спаў Бімба. Малы схіліўся над ім. Панюхаў яго. Асцярожна пагладзіў шурпатай далонькай галоўку шчанюка.

— Бімба, заўтра мы паедзем да бабулі, — сказаў ён. — Дабранач, Бімба! Добрых сноў табе, Бімба!

ПА ПЫТАННЯХ НАБЫЦЦЯ КНІГ ЗВЯРТАЙЦЕСЯ:
г. Мінск, тэл. (8-10-375-17) 272-29-75;
e-mail: popuri@mail.ru; mail@popuri.ru; www.popuri.ru;
г. Масква, ТАА «Выдавецкі дом “Белкніга”»,
тэл. (495) 276-06-75; e-mail: popuri-mos@mail.ru,
popuri-m@mail.ru.

0+

Літаратурна-мастацкае выданне

ЛІНДГРЭН Астрыд

МАЛЫ І КАРЛСАН, ЯКІ ЖЫВЕ НА ДАХУ

Для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту

Пераклад са шведскай мовы — *Алеся Башарымава*
Мастак — *Арсен Джанік’ян*

Адказны рэдактар — *Наталля Давыдоўская*
Стылістычны рэдактар — *Надзея Кудрэйка*
Вёрстка — *Вадзім Нога*
Карэктар — *Віктар Іваноў*
Афармленне вокладкі — *Ніна Дулуб*

Падпісана ў друк 20.10.2019. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 12,29. Тыраж 3100 экз. Заказ 9445.
Дата вытворчасці: 12.2019.

ТАА «Папуры». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў №1/151 ад 24.01.2014.
Рэспубліка Беларусь, 220113, г. Мінск, вул. Мележа, 5, корп. 2, к. 403.

Надрукавана ў друкарні «Фактар-Друк».
Украіна, 61030, г. Харкаў, вул. Саратаўская, 51.
Тэл.: + 380 57 717 53 57.

Малы і Карлсан,
які жыве на даху

«На самай звычайнай стакгольмскай вуліцы ў самым звычайным доме жыве самая звычайная сям'я на прозвішча Свантэсан...»

Так пачынаюцца незвычайныя прыгоды Малога і Карлсана, якіх палюбілі дзеці і дарослыя ва ўсім свеце. Далучайся і ты да вясёлай, кранальнай і трошачкі сумнай чытанкі!

Упершыню на беларускай мове —
усе тры кнігі пра Малога і Карлсана!

ПОПУРРИ
popuri.ru
ISBN 978-985-15-4259-4
9 789851 542594
0+

Астрыд Ліндгрэн

Малы і Карлсан, які жыве на даху